КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 42 (265) ◂ 11 лістапада ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час



ІНА КУЛЕЙ

Стар. 6

**НІ БЯСПЕКІ, НІ АЛЬТЭРНАТЫВЫ**

Для Беларусі будаўніцтва атамнай станцыі не вырашае праблему залежнасці ад Расіі

Стар. 5

**ДНЯСТРОЎСКІ ХАОС**

На мінулым тыдні набыў дынаміку палітычны працэс у Малдове і Прыднястроўі. Пра прычыны і магчымыя наступствы апошніх падзей журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з малдаўскім журналістам Алегам Сіняевым

Стар. 12

**ЗАБОЙСТВА ВІЛЬГЕЛЬМА КУБЭ**

Стар. 14–15

ISSN 2218-2144

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**КАМУ ПАТРЭБНЫЯ МАЛАДЫЯ ІНВАЛІДЫ?**

Сацыяльны рэпартаж Таццяны Шапуцька

▸ З НАГОДЫ

# КРАІНУ ЧАКАЕ МІЛІТАРЫЗАЦЫЯ

Вольга ХВОІН

**Кіраўнік Беларусі мае намер паставіць краіну пад ружжо. І ніякіх сродкаў для гэтага не шкада. У Лукашэнкі цяпер новая ідэя — стварыць апгрэйджаны варыянт арміі з упорам на тэрытарыяльныя войскі. Яна будзе налічваць каля 120–150 тысяч чалавек. Камандаваць рэгіянальнымі злучэннямі войскаў тэрытарыяльнай абароны будуць кіраўнікі абласцей і Мінска, у сувязі з чым апошнім і прысвоены высокія воінскія званні.**




У сярэдзіне кастрычніка пачалася шырокамаштабная праверка сістэмы тэрытарыяльнай абароны краіны з мэтай ацэнкі яе эфектыўнасці. Фінальным акордам сталі сумесныя камандна-штабныя вучэнні войскаў тэрытарыяльнай абароны з узброенымі сіламі, іншымі войскамі і воінскімі фарміраваннямі. Рысу вайсковым вучэнням Лукашэнка падвёў, заявіўшы аб намеры мілітарызаваць краіну. Паводле яго слоў, цяпер тэрытарыяльная абарона павінна мець агульнадзяржаўны і ўсенародны характар.

А вертыкаль мусіць займацца не толькі гаспадарчымі і ідэалагічнымі пытаннямі, але і бяспекай краіны. Далейшае развіццё тэрытарыяльнай абароны і яе падрыхтоўка павінны быць цалкам падпарадкаваныя патрабаванням сучаснасці, гэтыя сілы не павінны забяспечвацца матэрыяльнымі рэсурсамі па астатkаваму прынцыпу. І калі ў некага ў часы крызісу баліць галава пра тое, дзе ўзяць грошы на хлеб надзённы, то такі чалавек зусім не дальнабачны. «Хто сёння разважае пра грошы, калі размова ідзе пра бяспеку, пра абарону, наўрад ці гэта нашы прыхільнікі, наўрад ці гэта людзі, якія хочуць захаваць недатыкальнасць і незалежнасць краіны, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — …Я — прэзідэнт, вы мяне выбралі, і я буду прымаць рашэнні, трэба гэта ці не, мэтазгодна ці не, дорага ці не. Я ўмею лічыць грошы. Я разбяруся сам, я больш інфармаваны чалавек».

Ён запэўніў, што ў Беларусі будзе прадоўжана падрыхтоўка Узброеных Сіл і сіл тэрытарыяльнай абароны: «Мы стварылі тэрытарыяльныя органы — гэта танней, чым мець прафесійную армію, і мы будзем рыхтаваць нашых людзей. Праз год гэта будуць ідэальныя войскі, а ў ваенны час — 120 тысяч, ні многа ні мала». Кіраўнікам рэгіёнаў (губернатарам абласцей) прысвоеныя генеральскія званні, бо ў ваенны час менавіта яны будуць адказваць як за функцыянаванне эканомікі, так і за пытанні абароны. Лукашэнка таксама дадаў, што ў тэрытарыяльныя фарміраванні будуць актыўна прыцягвацца прадстаўнікі бізнэсу: «Яны павінны абараняць яшчэ і сваю ўласнасць, акрамя сям'і і зямлі. І гэта людзі вельмі падрыхтаваныя, і сярод іх вельмі шмат нашых ваенных людзей».

Палітычны аглядальнік Раман Якаўлеўскі пакуль не схільны драматызаваць сітуацыю, маўляў, гаварыць аб стварэнні ваенізаванай вертыкалі зарана, але тэндэнцыя ўсё ж прасочваецца неаптымістычная. «Першыя сакратары абкамаў у савецкі час на выпадак вайны таксама мелі званне генерал-лейтэнтаў. Так што кардынальна для краіны гэта не новае. Дакладна паўнамоцтвы новаяўленых генерал-губернатараў пакуль не вядомыя. На маю думку, гэта падвысіць дысцыпліну ў вертыкалі, узмоцніць іх паўнамоцтвы. Мусіць быць прыняты яшчэ шэраг нарматыўных актаў для рэгулявання гэтых функцый, — разважае Якаўлеўскі. — Але такія крокі сведчаць аб тым, што Беларусь пераходзіць ад аўтарытарызму да таталітарызму. Татальны кантроль, татальнае кіраўніцтва ўсім. І самае адметнае — да гэтага прыцягваюцца бізнэсоўцы. Можна прадбачыць, што на ўтрыманне гэтага войска будзе ўведзены адмысловы падатак, а краіну ўвогуле чакае мілітарызацыя».

Людзі, датычныя да вайсковай справы, аптымізму кіраўніка дзяржавы аб супервойску не падтрымліваюць. З заходняга ад Беларусі боку (а менавіта Захад Лукашэнку палохае) — тэхналагічна моцнае NATO. Супрацьпаставіць гэтай сіле можна толькі сучасныя сродкі СПА, авіяцыі, радыёэлектроннай галіны. Узровень беларускага рэгулярнага войска — дэмбелі не будуць спрачацца — сягае ў бок шырокай паркава-гаспадарчай дзейнасці і страявой падрыхтоўкі. Тэрытарыяльная абарона тым больш рызыкуе выглядаць на манер партызанкі. Да таго ж было б цікава ведаць, ад каго канкрэтна рыхтуецца бараніцца Беларусь. Не выключана, што вайсковыя патугі — метад пераключыць увагу з сацыяльных праблем на глабальныя. Але такі паварот пакуль выглядае як падкоп пад сябе. Падзеі бягучага года і без таго ўшчэнт разбілі вобраз мірнай квітнеючай Беларусі, для замацавання эфекту засталося толькі накачаць мужчынскае насельніцтва думкамі аб вайсковым супрацьве.

Ці праз такую ідэю ёсць намеры пашырыць сілавыя структуры і іх паўнамоцтвы? Прынамсі зварот да кіраўніцтва МУС дае неаптымістычную ўстаноўку на будучыню. «Міністру ўнутраных спраў трэба забыць такія паняцці, як прыстойна-непрыстойна, як на нас паглядзяць, як нас ацэняць, дрэнна пра нас не напісалі б і не сказалі б. Гэта не справа міністра ўнутраных спраў. Гэта справа палітыкаў. А ваша справа — строга і прынцыпова рэагаваць на любыя дзеянні, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — А то ў нас пачынаючы ад участковага да суддзі ўсе сталі палітыкамі. Маўляў, мы прынялі б меры, але мы не ведаем, якая будзе на гэта рэакцыя міжнароднай грамадскасці. Што гэта за глупства такое? Вы ў мяне, калі ласка, не забірайце мае функцыі і паўнамоцтвы. Гэта я буду потым разбірацца, як будзе рэагаваць міжнародная грамадскасць. Ваша задача — дзейнічаць строга ў адпаведнасці з законам і логікай развіцця нашага грамадства».

Каб не прыгнечваць змрочнымі прагнозамі, прыўнясём ноту гумару ад палітычнага аглядальніка Рамана Якаўлеўскага: «Літаральна праз некалькі дзён пасля заявы стварыць у Беларусі тэрытарыяльную абарону, у Расіі абвясцілі аб стварэнні касмічнай абароны. У Саюзнай дзяржаве цяпер будзе і партызанская абарона, і касмічная — ад марсіян. Увогуле, для Беларусі вайсковыя амбіцыі выглядаюць як фарс».

# ФАКТЫ, ПАДЗЕІ, ЛЮДЗІ

2

СПРАВА

## ХУТКІ СУД

Вольга ХВОІН

**Судовае следства па справе Дзмітрыя Канавалава і Уладзіслава Кавалёва, якіх абвінавачваюць у выбуху ў метро 11 красавіка 2011 года, завершана. У працэсе абвешчаны перапынак да 14 лістапада. У гэты дзень у судзе пачнуцца спрэчкі бакоў.**



Апошнімі матэрыяламі, агучанымі ў ходзе гэтага этапу судовага працэсу па справе аб тэрактах, былі допыты жыхара Віцебска Жолудзева, які меў агульных сяброў з Канавалавым і Кавалёвым. З іх стала вядома пра паходжанне двух 75-грамовых і адной 400-грамовай тратылавых шашак, якія, паводле матэрыялаў справы, Канавалаў выкарыстаў пры вырабе выбуховых рэчываў. Гэтыя шашкі Жолудзеў выкраў падчас сваёй службы ў войску на пачатку 2000-х гадоў. У сярэдзіне 2000-х гадоў дзве 75-грамовыя шашкі ў Жолудзева набыў сусед Канавалава Яўген Куксёнак. Затым яны апынуліся ў Кавалёва, а потым — у Канавалава.

Усе хадайніцтвы абароны аб выкліку новых сведак суд адхіліў. Не выклікалі ў суд экспертаў ФСБ Расіі, братоў Мурашка з Віцебска, якія падазраваліся ў здзяйсненні выбухаў у 2005 годзе, рабочых метрапалітэна, якія праводзілі напярэдадні выбуху рамонтныя работы, і машыніста другога цягніка, што прыбыў на «Кастрычніцкую» пасля выбуху.

Таксама суд адхіліў хадайніцтвы аб выкліку супрацоўнікаў сілавых ведамстваў, якія затрымлівалі Кавалёва, Канавалава і Яну Пачыцкую на кватэры ў Мінску. Суддзя патлумачыў, што акалічнасці затрымання выкладзены ў справе. Адвакату Улада Кавалёва было адмоўлена ў аглядзе носьбітаў, з якіх былі канфіскаваныя запісы камер назірання.

«Можна сказаць, што суд заняў аднабокую пазіцыю па лініі пракуратуры, — лічыць праваабаронца, былы следчы Алег Волчак. — Заўважце, на апошніх пасяджэннях нават з'явілася нейкая нервовая рэакцыя суддзі на выказванні адвакатаў. Гэты артыкул пагражае абвінавачваемым расстрэлам. І суд мусіў задавальняць усе хадайніцтвы з улікам складанасці справы. А атрымалася так, што Аляксандра Крутога, які прымаў актыўны ўдзел у працэсе як прадстаўнік сваёй пацярпелай дачкі, на пачатку разгляду справы ізалявалі. Практычна ўсе экспертызы трактуюцца на карысць абароны. Адсутнасць на Дзмітрыі Канавалаве, яго вопратцы слядоў выбуховых рэчываў, хаця ён знаходзіўся ў момант выбуху над платформай метро. Эксперты ФСБ, якія дапамагалі ў расследаванні справы, паказалі, што выбуховае прыстасаванне было выраблене не ў Віцебскай вобласці. Відэазапіс з метро, дзе Канавалаў ходзіць туды-сюды з сумкай, эксперты ФСБ адмовіліся прымаць да разгляду, бо ён мае выгляд «нарэзкі». Падобных эпізодаў можна набраць яшчэ з дзясятак».

Напрыклад, па меркаванні Волчака, не зразумела, як атрымалася па працягу сутак знайсці Канавалава ў чужым горадзе на знятай на некалькі дзён кватэры. Тым больш, што пасля выбуху, паводле паказанняў сведак, ён не выходзіў з кватэры. Чаму няма заключэння ізраільскіх экспертаў, якія прыязджалі ў Беларусь і адразу ж з'ехалі? Чаму ў матэрыялах справы няма матывацыі іх адмовы займацца гэтым выбухам?

«Увогуле, у справе няма адзінай лініі, то бок няма выбудаванай канструкцыі ад задумы да рэалізацыі. Фармулёўка «дэстабілізацыя абстаноўкі» выглядае вельмі нацягнутай. Калі Канавалаў і мае дачыненне да выбуху ў мінскім метро, то не як адзіночка. Уладзіслаў Кавалёў, на маю думку, мусіў бы даўно быць адпушчаны, бо на яго ўвогуле нічога няма. Але, калі сыходзіць з досведу судовых працэсаў, то, відаць, ёсць толькі адно пытанне: каго з іх двух адправяць на пажыццёвае, а каго расстраляць», — лічыць праваабаронца.

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

## КАРЭТНІКАЎ НА ВОЛІ

Таццяна УЛАСЕНКА

**9 лістапада пасля 10 сутак арышту выпусцілі на волю лідара «Правага альянсу» Юрася Карэтнікава.**

Нагадаем, Юрась разам з паплечнікамі прыняў удзел ва ўшанаванні памяці продкаў у Курапатах на «Дзяды». Пасля мерапрыемства каля ўніверсаму «Паўночны» яго затрымалі. У выніку суддзя савецкага раёна Мінска Паўлічэнка даў хлопцу 10 сутак, а яго знаёмаму Сяргею Савіну — 7 сутак — за «дробнае хуліганства». Нібыта хлопцы сярод белага дня «спраўлялі малую патрэбу» ў шматлюдным месцы.

«Некаторы час да мяне прыглядаліся і чакалі публічнай дзейнасці, — сказаў па вызваленні Юрась Карэтнікаў. — Але зразумела, што ім для затрымання асаблівай нагоды не трэба. Бо мы не выкрыквалі ніякіх лозунгаў, не трымалі гістарычнай сімволікі. Мяне проста выкралі людзі ў адмысловай чорнай форме, пад'ехаўшы на мікрааўтобусах без нумарных знакаў. Потым адбывалася заканамерная дзяржаўная працэдура... На Акрэсціна я з паплечнікам адразу абвясціў галадоўку. Да мяне ў СІЗА завіталі 4 чалавекі, двое — у масках, двое — супрацоўнікі КДБ у форме. І спрабавалі прымусіць адказваць на іх пытанні, запалохвалі, маўляў, гэта толькі пачатак твайго турэмнага шляху, і твая свабода ў тваіх руках».

«Я лічу сябе вольным чалавекам ад нараджэння. Не парушаў ніводнага закону. А вось суддзя, які выносіў мне прысуд, ведаў, што робіць злачынства. Бо абвінавачванне было сапраўды надуманым і дзікунскім. Я адкрыта вярнуўся ў Беларусь. Я адкрыта жыву. І мне тут баяцца няма чаго. Таму я буду працягваць жыць на сваёй Радзіме, не губляючы кантактаў і з замежжам», — падкрэсліў Юрась.

ПРАЕКТ

## «БАМБЕЛ–3»

**9 лістапада амбасадар Майра Мора, кіраўнік Прадстаўніцтва Еўрапейскага саюза ў Беларусі, наведала пункт перасячэння беларуска-польскай мяжы «Рудаўка Лясная», каб прыняць удзел у цырымоніі закрыцця праекта ў сферы кіравання межамі «Бамбел–3», у які Еўрапейскі саюз зрабіў унёсак у памеры 7 мільёнаў еўра.**

Асноўнай мэтай гэтага двухгадовага праекта тэхнічнай дапамогі было стварэнне сучаснай камунікацыйнай сеткі на аснове оптавалаконнага кабелю па ўсёй даўжыні беларуска-польскай мяжы. Сеткай будуць карыстацца беларускія памежныя і мытныя службы. Такая інфраструктура дазваляе ўжываць сучасныя сродкі біяметрычнага кантролю і праграмнае забеспячэнне для электронных мытных дэкларацый, забяспечвае доступ да міжнародных базаў даных на пунктах перасячэння мяжы. У цэлым, яна дазваляе зрабіць працэдуры кантролю на межах больш эфектыўнымі і хуткімі. Працы скончыліся ў верасні, у адпаведнасці з планам.

Амбасадар Мора падзякавала Дзяржаўнаму памежнаму камітэту Рэспублікі Беларусь, а таксама тром кампаніям-падрадчыкам — «Белабстэлекаму», «Цэнтрсувязьбуду» і «Овэ Аруп» — за плённае супрацоўніцтва ў рамках праекта. «Дапамагаючы Беларускаму дзяржаўнаму пагранічнаму камітэту нарасціць свой патэнцыял, мы дапамагаем скараціць час транзіту, спрыяем развіццю турызму і бізнэсу ў Беларусі, развіццю законнага гандлю паміж краінамі, а таксама пашырэнню кантактаў паміж людзьмі», — адзначыла амбасадар.

З 2001 года Еўрапейскі саюз выдзеліў больш як 47 мільёнаў еўра на ажыццяўленне праектаў у сферы кіравання межамі толькі ў Беларусі, не ўлічваючы рэгіянальныя праекты, у якіх Беларусь прымае ўдзел. Еўрапейскі саюз запланаваў прафінансаваць у памеры 2,6 мільёнаў еўра новы праект у рамках «Усходняга партнёрства», скіраваны на пашырэнне магчымасцяў кантролю на мяжы паміж Беларуссю і Украінай. Палова гэтых сродкаў зарэзерваваная для Беларусі. Акрамя таго, Еўрапейскі саюз зробіць унёсак у памеры прыкладна 20 мільёнаў еўра ў рэканструкцыю чатырох пунктаў перасячэння мяжы ў рамках дзвюх праграм памежнага супрацоўніцтва ў 2012–2013 гадах.

**Паводле інфармацыі Delegation of the European Union to Belarus**

СУД

## АБВІНАВАЧВАННЕ ПЕРАКВАЛІФІКУЮЦЬ

Вольга ХВОІН

**У судзе над кіраўніком праваабарончага цэнтру «Вясна» Алесем Бяляцкім абвешчаны перапынак да 16 лістапада. Ён патрэбны, каб перакваліфікаваць справу. «Новае абвінавачванне будзе істотна адрозніваццa ад папярэдняга», — заявіў падчас суда пракурор.**



Калегі праваабаронцы мяркуюць, што можа быць скарэктаваная фармулёўка абвінавачвання, бо асноўны доказ па справе — дакументы, перададзеныя літоўскім бокам, — Мінюст Літвы афіцыйна назваў несапраўднымі.

Ёсць і верагоднасць, што будзе выстаўлена новае абвінавачванне паводле 193–1 Крымінальнага кодэкса — «удзел у незарэгістраванай арганізацыі». У судовым працэсе Алесь Бяляцкі не адмаўляе таго, што працуе ад імя праваабарончага цэнтру «Вясна», які пазбавілі рэгістрацыі. Ён заявіў на судзе, што пазбаўленне ПЦ «Вясна» рэгістрацыі было незаконным — гэта прызнаў у 2007 годзе Камітэт ААН па правах чалавека і абавязаў беларускія ўлады зарэгістраваць «Вясну» цягам 90 дзён. Але гэта не было выканана. «Мы лічым, што парушаюцца нашы правы, і не збіраемся спыняць праваабарончую дзейнасць», — падкрэсліў Бяляцкі.

Цяпер кіраўніка «Вясны» і віцэ-прэзідэнта Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека Алеся Бяляцкага абвінавачваюць паводле часткі 2 артыкула 243 Крымінальнага кодэкса (утойванне даходаў у асабліва буйным памеры). Санкцыя гэтага артыкула прадугледжвае пакаранне да сямі гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці. Ад 4 жніўня Алесь Бяляцкі знаходзіцца пад вартай у СІЗА №1 Мінска.

Падчас судовага пасяджэння 10 лістапада да справы быў далучаны шэраг дакументаў. Суд далучыў да справы копіі ліста Міністэрства юстыцыі Літвы, у якім паведамляецца, што інфармацыя пра рух сродкаў на рахунках Бяляцкага і Стэфановіча (юрыст ПЦ «Вясна») з'яўляецца несапраўднай. Гэты ліст завераны пячаткамі міністэрства і амбасады Літвы.

Быў далучаны да справы ліст арганізацыі Civic rights defenders, якая давала ПЦ «Вясна» гранты на праваабарончую дзейнасць. У лісце гаворыцца, што арганізацыя не мае ніякіх маёмасных прэтэнзіяў да Бяляцкага.

Былі зачытаныя звароты міжнародных праваабарончых арганізацыяў у абарону Бяляцкага і далучаныя да справы. Таксама суд далучыў да справы копію дыплома прэміі Нарвежскага Хельсінскага камітэта Алесю Бяляцкаму за актыўны ўдзел у барацьбе за правы чалавека, дакумент аб рашэнні горада Генуі (Італія) пра тое, каб надаць Бяляцкаму ганаровае грамадзянства Генуі «за стойкасць у барацьбе за правы чалавека». Алесь Бяляцкі таксама атрымліваў еўрапейскую прэмію свабоды імя Андрэя Сахарава.

СІСТЭМА

## УЖО КРАДУЦЬ НАСТАЎНІКІ

**Настаўніцы геаграфіі адной са сталічных школ трэба было выплачваць крэдыт за кватэру і ўтрымліваць двух дзяцей. І яна прыдумала шакуючую злачынную схему.**

На адзін з урокаў яна прапанавала школьнікам прынесці з хаты фотаапараты, каб зняць нейкі вучэбны матэрыял. Прагучаў званок на перамену — і яна выставіла дзяцей за дзверы, матываваўшы гэта неабходнасцю праветрыць кабінет. Пакуль у клас паступала свежае паветра, настаўніца скрала ў вучняў тры фотаапараты.

Бацькі напісалі заяву ў міліцыю. Атрымаўшы выклік на допыт, настаўніца перахавала скрадзенае ў камеры захоўвання ў краме непадалёк ад дома. Аднак у міліцыі ўсё ж прызналася ў злачыстве, распавялі ў прэс-службе ГУУС Мінгарвыканкама.

За крадзеж яна можа патрапіць у турму на чатыры гады.

**Паводле інфармацыі Руху «За свабоду»**

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ВЫБАРЫ ЎЖО НА НОСЕ?

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Выбары ў парламент яшчэ не абвешчаныя, але некаторыя раяць да іх рыхтавацца. І рыхтавацца тэрмінова. Бо не выключана, што выбары пройдуць значна раней, чым чакалася. «Таямніцу следства» ў сераду раскрыла расійская газета «Коммерсант».**




Паводле расійскіх крыніц, улады Беларусі маюць намер правесці парламенцкія выбары ў красавіку наступнага года. Паводле «Коммерсанта», плануючы правесці датэрміновыя выбары, Аляксандр Лукашэнка разлічвае пазбегнуць ціску Захаду, які патрабуе ад яго дэмакратызацыі выбарчага заканадаўства.

Як паведаміла газеце крыніца, блізкая да кіраўніцтва беларускага парламента, улады рыхтуюцца да правядзення будучых парламенцкіх выбараў у красавіку наступнага года, хаця з самага пачатку меркавалася, што яны пройдуць восенню. Паводле звестак крыніцы, рашэнне аб пераносе выбараў звязанае са спробай Мінска ліквідаваць адзін з раздражняльнікаў у яго адносінах з Захадам. Патрабаванне ўнесці змяненні ў заканадаўства Беларусі, якія пазбавілі б уладу магчымасці фальсіфікаваць выбарчы працэс, застаецца каменем спатыкнення ў дыялогу Беларусі з ЕС.

Газета зазначае, што для Беларусі карэкціроўка даты выбараў ужо стала звыклай практыкай. Так, у 2006 годзе ўлады правялі прэзідэнцкія выбары на чатыры месяцы раней за тэрмін — у сакавіку замест ліпеня. Тады афіцыйныя структуры тлумачылі сваё рашэнне імкненнем зрабіць так, каб выбарчая кампанія не перашкодзіла ўборцы ўраджаю. Праўда, беларуская апазіцыя сцвярджала, што ўлады проста не далі ёй правесці паўнавартасную выбарчую кампанію. На апошніх прэзідэнцкіх выбарах адбылося тое ж самае — замест сакавіка 2011 года яны прайшлі ў снежні 2010 года.

Пакуль што афіцыйныя асобы гэтую інфармацыю абвяргаюць. Пытанне аб пераносе даты парламенцкіх выбараў на больш ранні тэрмін не абмяркоўвалася ні ў парламенце, ні ў Цэнтрвыбаркаме. Як паведамілі ў прэс-службе Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, пытанне аб пераносе даты выбараў у парламенце не абмяркоўвалася і ніякіх ініцыятыў адносна гэтага парламентарыям не паступала. Сакратар Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Мікалай Лазавік заявіў, што ў ЦВК Беларусі такіх ініцыятыў таксама не ўносілася.

«Выбары ў Беларусі прызначае прэзідэнт. Яны павінны прайсці ў тэрміны, вызначаныя Канстытуцыяй. 18 кастрычніка маючая адбыцца выбарчая кампанія абмяркоўвалася на сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі са старшынёй Цэнтральнай выбарчай камісіі Лідзіяй Ярмошынай. Там было вызначана, што выбары ў парламент пройдуць прыкладна ў сярэдзіне верасня 2012 года, не пазней за 26 верасня. Больш ніякіх установак мы ні ад прэзідэнта, ні ад парламента не атрымлівалі», — заявіў Лазавік.

Аднак гэтыя заявы выклікаюць хутчэй заклапочанасць, чым спакой. Народу ўжо столькі разоў абяцалі шмат усялякага рознага, што афіцыйным крыніцам папросту няма даверу. Значна больш даверу «агенцтву АБС» (адна бабка сказала). І калі «Коммерсант» піша пра беларускія выбары, то, значыць, у яго нейкая інфармацыя пра гэта ёсць. Тым больш, што «Коммерсант», — газета сур'ёзная, гэта не нейкі малавядомы інтэрнэт-партал.

Палітыкі пакуль што вагаюцца наконт удзелу ў парламенцкіх выбарах.

«Рэжым хоча, каб апазіцыя пайшла ў «выбарчую кампанію» ў час, калі палітвязні сядзяць у турмах. Гэта прынцыповы момант для ўлады. Пакуль ёсць хоць адзін палітвязень — асабіста я ні ў якіх «выбарах» не ўдзельнічаю, ні ў якіх іншых палітычных акцыях, акрамя акцый па вызваленні палітвязняў», — заявіў лідар кампаніі «Гавары праўду!» Уладзімір Някляеў.

«Для АГП не з'яўляецца актуальным пытанне «Калі праводзіць?» — заявіў лідар Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька. — Дня нас важна разуменне таго, што гэта будзе — выбары ці чарговая кампанія без правілаў. Мы гатовы да выбараў, і калі гэта будуць выбары па стандартах АБСЕ — мы гатовыя хоць заўтра выставіць сваіх кандыдатаў на 70% выбарчых акругаў. І гэта будуць тыя людзі, якія здольныя выходзіць у другі тур і выйграваць. Калі гэта будзе кампанія без правілаў, то наш адказ адназначны — няма сэнсу быць дэкарацыяй у гэтым спектаклі».

То бок, пакуль апазіцыя вагаецца, на якіх умовах яна будзе ўдзельнічаць у выбарах. Хаця некаторыя сваю выбарчую кампанію ўжо пачынаюць. І зусім не ў тым рэчышчы, пра якое кажуць улады і апазіцыянеры.

Экс-кандыдат у прэзідэнты Беларусі Дзмітрый Ус працягвае дабівацца змянення выбарчага заканадаўства. Палітык фарміруе ініцыятыўную групу, якая зоймецца зборам подпісаў для змянення трох артыкулаў Выбарчага кодэкса.

Як паведаміў Ус, стварэнне групы пачалося ў канцы кастрычніка. На сёння ў ёй ужо каля тысячы чалавек. «Мы разлічваем, што да студзеня, калі пройдзе сход ініцыятыўнай групы, у яе складзе будзе ўжо да 5 тысяч чалавек», — сказаў палітык.

У выпадку афіцыйнай рэгістрацыі членам групы на працягу месяца трэба будзе сабраць 50 тысяч подпісаў, каб законапраект аб унясенні змяненняў у Выбарчы кодэкс разглядзеў парламент.

«Наша галоўная мэта — змяніць выбарчую сістэму Беларусі, зрабіць так, каб улік галасоў грамадзян і падпісанне выніковых пратаколаў сталі празрыстымі», — падкрэсліў экс-кандыдат у прэзідэнты.

Паводле яго слоў, размова ідзе пра змяненне артыкулаў 34, 35 і 72 Выбарчага кодэкса. Неабходна, каб кандыдаты мелі права накіроўваць ва ўчастковыя камісіі сваіх прадстаўнікоў, спіс якіх павінен быць пададзены за 15 дзён да галасавання. Прадстаўнікам кандыдата павінны выдавацца пасведчанні членаў выбаркамаў на працягу трох дзён.

Апрача таго, членам камісіі, якія прадстаўляюць кандыдатаў, павінна быць дадзена права ставіць свой подпіс на адваротным баку кожнага бюлетэня. Гэта, на думку Уса, дазволіць пазбегнуць незаконнага ўкідвання бюлетэняў у скрыні падчас датэрміновага галасавання і фальсіфікацый падчас падліку галасоў.

Палітык упэўнены, што яго ініцыятыўнай групе ўдасца сабраць не менш за мільён подпісаў. «Усе людзі цвярозага розуму ў Беларусі павінны падпісаць, каб у нас былі сумленныя і адкрытыя выбары», — падкрэсліў Ус.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ



### АНДРЭЙ КАБЯКОЎ

Андрэй Кабякоў прызначаны паслом Беларусі ў Расіі, пастаянным прадстаўніком Беларусі пры Еўразійскім эканамічным саюзе (ЕўрАзЭС) па сумяшчальніцтве. Адпаведнае рашэнне прыняў 8 лістапада Аляксандр Лукашэнка, паведамляе прэс-служба прэзідэнта.

На пасадзе амбасадара ў РФ Андрэй Кабякоў зменіць Васіля Даўгалёва, які ўзначальвае беларускае дыппрадстаўніцтва ў Маскве ад жніўня 2006 года.

Андрэй Кабякоў нарадзіўся 21 лістапада 1960 года ў Маскве. У 1983 годзе скончыў Маскоўскі авіяцыйны інстытут ім. Арджанікідзэ, у 1991 годзе — Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі ім. В.У. Куйбышава, у 1991 годзе — Інстытут паліталогіі і сацыяльнага кіравання КПБ.

Працоўную дзейнасць пачаў майстрам механазборачнага цэха на заводзе ім. С.І. Вавілава ў Мінску. У 1985–1988 гадах працаваў на заводзе «Дыяпраектар» у Рагачове, у 1988–1989 гадах быў інструктарам Рагачоўскага гаркама КПБ. У 1991–1995 гадах працаваў начальнікам планава-эканамічнага аддзела, намеснікам дырэктара па эканоміцы — начальнікам планава-эканамічнага аддзела завода «Дыяпраектар». Затым працаваў намеснікам начальніка Службы кантролю прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, у кіраўніцтве Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, намеснікам прэм'ер-міністра, міністрам эканомікі, намеснікам кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі.

### НАСТАССЯ НОВІКАВА



Настасся Новікава (вагавая катэгорыя да 58 кг) у Парыжы ўпершыню ў кар'еры заваявала золата чэмпіянату свету па цяжкай атлетыцы. У двубор'і па суме двух практыкаванняў Настасся падняла 237 кг (101 кг у рыўку + 136 кг у штуршку).

Для бронзавай медалісткі Алімпіяды–2008 у Пекіне Настассі Новікавай гэта першае золата чэмпіянатаў свету. Раней яна станавілася срэбнай медалісткай першынства планеты, а таксама тройчы заваёўвала золата чэмпіянатаў Еўропы.

Чэмпіянат свету ў Парыжы з'яўляецца другім і заключным этапам адбору на лонданскую Алімпіяду–2012, які ажыццяўляецца па суме балаў, набраных камандамі па выніках першынстваў планеты 2010 і 2011 гадоў.

У жаночых спаборніцтвах чэмпіянату свету ў Парыжы акрамя Новікавай (да 58 кг), на памост выйдуць таксама Ганна Бацюшка (да 63 кг), Ірына Кулеша (да 75 кг), Дзіна Сазанавец (да 69 кг) і Марына Шкерманкова (да 69 кг).

За мужчынскую каманду выступаць Андрэй Рыбакоў (вагавая катэгорыя да 85 кг), Вадзім Стральцоў (да 94 кг), Аляксандр Макаранка (да 94 кг), Міхаіл Аўдзееў (да 105 кг), Яўген Жарнасек (звыш 105 кг) і Дзмітрый Ворнік (звыш 105 кг). Андрэй Арамнаў адмовіўся ад удзелу ў Чэмпіянаце свету.

### СЯРГЕЙ МІХАЛОК



Гурт «Ляпіс Трубяцкой» прадставіў новы кліп «Не быць скотам», які «ўзарваў» беларускі сегмент інтэрнэта. Гэтая песня — першы сінгл з будучага альбома «Ляпсаў» і першая песня ў гісторыі гурта, напісаная яе лідарам Сяргеем Міхалком на вершы класіка беларускай паэзіі Янкі Купалы.

«Я доўга не мог падступіцца да гэтага вершу, бо тут у некалькіх радках закладзены эпас і гісторыя цэлага народа, — распавядае Сяргей Міхалок. — Мяне ўзрушыла, што вершы, напісаныя шмат гадоў таму і якія былі ў той час злабадзённымі, і сёння гучаць вельмі актуальна. Пацешна, што Купала можа падказаць усім беларусам, што рабіць і як жыць тут і цяпер — прычым лепш, чым любыя прамовы сучасных палітыкаў».

Песня «Не быць быдлу» стала першай ластаўкай з будучага альбома «Ляпіса Трубяцкога», які выйдзе ў 2012 годзе. «Я свядома змяніў назву песні, — тлумачыць Сяргей Міхалок. — Таму што для мяне зараз «Не быць скотам» — то бок не быць нямой скацінай, жывёлай, абыякавай да ўсяго, што дзеецца вакол і задаволенай змесцівам сваёй кармушкі, — гэта наогул галоўны дэвіз. Я нават сабе татуіроўку зрабіў з гэтай фразай — на жываце».

▸ **АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ**

# ЦІ ВЫРАТУЕ БЕЛАРУСКУЮ МАДЭЛЬ НЭП?

Сяргей НІКАЛЮК

**Спробы рэфармавання беларускай эканомікі сутыкнуцца з супраціўам прадстаўнікоў «большасці», не здольнай выжыць у рынкавых умовах.**




Пачну з анекдота. Асуджанага вядуць на шыбеніцу. Ён цікавіцца ў канвою: «Які сёння дзень?» — «Панядзелак». — «Нішто сабе тыдзень пачынаецца!»

Пагадзіцеся, актуальны анекдот. 2011 год — першы год чацвёртай пяцігодкі. У снежні незразумела кім абраныя дэпутаты Чацвёртага Усебеларускага народнага сходу (УНС) ухвалілі асноўныя палажэнні Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2011–2015 гады. Рэкамендую перачытаць заключную частку — не пашкадуеце. Вось толькі адзін з абавязкаў, узятых на сябе ўладай: «Будзе забяспечана стабільнасць курсу беларускага рубля і захаванасць прыватных укладаў».

Абяцаць — не азначае ажаніцца. Мастацтвам раздаваць абяцанні дасканала валодалі камуністы. Свае абяцанні яны таксама афармлялі ў выглядзе пяцігадовых планаў, што не замінала ім планаваць адны паказчыкі, а рабіць справаздачы за іншыя.

Але перанясемся з мінулага ў сучаснасць. Даклад «адзінага палітыка» (АП), зачытаны на снежаньскім «усенародным вечы», зразумела, не абышоў увагай тэму жыллёвага будаўніцтва. Цытую: *«В будущей пятилетке окончательно решим вопросы доступности и качества жилья. Строительный потенциал страны должен обеспечить введение к 2015 году 42 млн. кв. метров жилья, что в 1,6 раза больше, чем в текущей пятилетке. Запланированное увеличение реальных денежных доходов должно к 2016 году сделать для основной массы населения доступным строительство жилья за счет собственных и заемных средств».*

А зараз звернемся да афіцыйнай статыстыкі. У 2010 годзе пры прагнозе ў 6,96 было пабудавана 6,7 мільёна квадратных метраў. План на бягучы — 7,5 мільёна квадратных метраў. У першы дзень лістапада прэм'ер-міністр Мясніковіч дакладваў АП, што, нягледзячы на ўсе складанасці на фінансавым рынку, урад свае абавязанні па будаўніцтве жылля выканае ў поўным аб'ёме, і да канца 2011 года будзе ўведзена ў эксплуатацыю… каля 6 мільёнаў квадратных метраў.

## Сучасны аналаг ЦК КПСС

Пяройдзем ад прыватнага выпадку да абагульнення. Безадказнасць — адна з базавых характарыстык аўтарытарнай улады. У Савецкім Саюзе безадказнасці КПСС быў нададзены канстытуцыйны статус. Канстытуцыя ўзору 1977 года, якая абвяшчала ў 6-м артыкуле партыю «кіроўнай і накіроўваючай сілай савецкага грамадства, ядром яго палітычнай сістэмы, дзяржаўных і грамадскіх арганізацый», механізму адказнасці ўладнага манапаліста за права кіраваць і накіроўваць не прадугледжвала.

Цяперашні варыянт беларускай Канстытуцыі прамога аналагу 6-га артыкула не ўтрымлівае, але было б дзіўна, калі б яе распрацоўнікі не скарысталіся савецкім досведам. Безадказнасць спараджае ўжо сам факт канцэнтрацыі ўлады ў руках кіраўніка дзяржавы. Яшчэ адна крыніца безадказнасці — нявызначанасць статусу прэзідэнцкай адміністрацыі. У той час, як ураду ў Канстытуцыі прысвечаны асобны раздзел, адміністрацыя ў асноўным законе згадваецца ўсяго адзін раз. Пра яе вядома толькі тое, што прэзідэнт яе «ўтварае, распускае і рэарганізуе». Аднак такая нявызначанасць не замінае адміністрацыі фактычна мець ролю ЦК КПСС, г. зн. кіраваць і накіроўваць у маштабах краіны.

Але вяршыняй безадказнасці з'яўляецца прыняцце дзяржаўных рашэнняў Усебеларускім народным сходам. Яго ўдзельнікі, што абвясцілі сябе «паўнапраўнымі прадстаўнікамі народа», прысвоілі сабе права ўхваляць асноўныя палажэнні праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны і даваць даручэнні канстытуцыйным органам улады.

Зразумела, што ў рэальнасці правам ухваляць, а тым больш даручаць «паўнапраўныя прадстаўнікі» не валодаюць. Прыкладам з дакладам Мясніковіча — толькі адна з ілюстрацый імітацыйнай прыроды «ўсенародных веча». АП не збянтэжыў той факт, што, паводле яго ўласнай трактоўкі месца і ролі УНС у палітычнай сістэме рэспублікі, ва ўрада няма права адмяняць прынятыя на веча рашэнні.

*«Власть должна подчиняться только воле народа»*, — гэта цытата, запазычаная з дакладу на Першым УНС. Аднак тая лёгкасць, з якой урад і Нацбанк, плануючы паказчыкі на 2012 год, перакрэслілі рашэнні Чацвёртага УНС, не пацвярджае гатоўнасці ўлады падпарадкоўвацца волі народа.

## І нахапаліся, і ўлезлі

Яшчэ адна цытата, гэтым разам са Звароту ўдзельнікаў Чацвёртага УНС: «Пад кіраўніцтвам прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Г. Лукашэнкі была створана беларуская мадэль развіцця, якая даказала сваю жыццяздольнасць нават ва ўмовах глабальнага фінансавага крызісу».

На працягу большай часткі 2011 года мы назіралі марныя спробы беларускай мадэлі даказаць сваё права на жыццё. Сутнасць мадэлі, як я ўжо неаднаразова адзначаў раней, палягае ў адміністрацыйнай канцэнтрацыі рэсурсаў з мэтай іх далейшага пераразмеркавання. Як першую, так і другую сваю задачу мадэль здольная выконваць дастаткова эфектыўна, аднак у яе ёсць сур'ёзны дэфект: яна не ў стане генераваць рэсурсы ва ўмовах рынкавай канкурэнцыі.

Да 2007 года галоўнай крыніцай росту рэальных прыбыткаў беларусаў заставаліся расійскія датацыі. Пасля двухразовага падвышэння кошту на газ улада змушана была звярнуцца да знешніх запазычанняў. У выніку валавая знешняя запазычанасць за першы год жыцця ў новых умовах падвоілася: з 6,9 да 12,5 мільярда долараў. Адначасова падвоілася і адмоўнае сальда плацежнага балансу: з –1,4 да –3,0 мільярда долараў.

Да канца першага паўгоддзя бягучага года знешняя запазычанасць склала ўжо 33 мільярды «зялёных». Як тут не ўзгадаць ганарлівай заявы АП на Другім УНС у маі 2001 года: *«Мы не разбазарили народное достояние, не нахватались иностранных займов, не влезли в долги, отдавать которые пришлось бы детям и внукам».* Сёння мы і нахапаліся, і ўлезлі, прычым улезлі па самыя вушы. У якасці каментара прыводжу несмяротны дыялог паміж былым дэпутатам Думы Кісай Вараб'янінавым і Астапам Бэндарам: *«Никогда, — принялся вдруг чревовещать Ипполит Матвеевич, — никогда Воробьянинов не протягивал руки. — Так протянете ноги, старый дуралей!»*

Улагоджванне патэнцыйных крэдытораў — важны элемент паўсядзённага жыцця вышэйшых беларускіх чыноўнікаў. Грошы неабходныя ўжо не на развіццё, не на падтрымку курсу нацыянальнай валюты, а на рэфінансаванне атрыманых раней крэдытаў. Беларуская мадэль рэсурсаў не генеруе. Яна іх пераразмяркоўвае, але камерцыйны крэдыт — гэта не бязвыплатныя датацыі. Іх неабходна вяртаць, прычым з працэнтамі. Тут ужо не да дзяцей і ўнукаў — як бы ногі не выпрастаць, прычым у рэжыме «тут і зараз».

Пераход на рынкавы механізм курсаўтварэння, адмова ад высокіх тэмпаў росту ВУП у 2012 годзе — гэта адмова ад беларускай мадэлі. Аднак не варта забываць, што ў мадэлі, акрамя эканамічнага, маюцца яшчэ і сацыяльна-палітычныя складнікі.

## Хто піша музыку?

Для разумення найбліжэйшых наступстваў інавацый, з якімі сёння выступаюць прадстаўнікі эканамічнага блоку ўрада, нам трэба разабрацца са словам «фетышызм», якое азначае сляпую глыбокую пашану чаго-небудзь. Фетышызм — гэта заўсёды спрашчэнне, гэта наданне таму ці іншаму дзеянню статусу «адзінага», здольнага змяніць аб'ект у адрыве ад іншых з'яў.

Фетышызм шматаблічны. У 2007 годзе мы сталі сведкамі яго інвестыцыйнай разнавіднасці. Адсюль задача па ўваходжанні ў трыццатку краін па якасці бізнэсклімату. З прыцягненнем замежных інвестыцый, аднак, атрымалася прамашка. Пры заданні ў 6,5 мільярда долараў за студзень-верасень прыцягнуць атрымалася ўсяго толькі 1,1 мільярда. Таму на змену інавацыйнаму фетышызму (прыватнаму выпадку фетышызму эканамічнага) прыйшоў фетышызм арганізацыйны. Міністэрства эканомікі абвясціла адмаўленне ад дырэктыўнага планавання.

Лозунг дня — пераход ад колькасных паказчыкаў да якасных. З гэтага часу прыярытэт будзе адводзіцца рэнтабельнасці продажаў, валавога дададзенага кошту, прадукцыйнасці працы, суадносін экспарту да аб'ёму вырабленай прадукцыі. Плануецца і рашучая адмова ад перакрыжаванага субсідавання (цэнтралізаванага пераразмеркавання рэсурсаў).

Схільнасць кідацца ў крайнасці — адна з базавых у айчыннай культуры, не здольнай да пошуку сярэдніх рашэнняў праз дыялог. Нескладана ўявіць, да якіх наступстваў прывядзе рашучае адмаўленне ад практыкі пераразмеркавання рэсурсаў: большасць дзяржаўных прадпрыемстваў папросту спыняцца. У адказ працоўныя калектывы пры актыўнай падтрымцы дырэктарскага корпуса пачнуць «стукаць каскамі». Хваля лабісцкіх патрабаванняў накрые краіну, і ўрад будзе змушаны ўвесь час ісці на саступкі. Замест рэформаў мы атрымаем набор «кульгавых рашэнняў», якія не дазваляюць замяніць мінусы размеркавальнай эканомікі плюсамі эканомікі рынкавай. Мінус на плюс, як вядома, дае мінус, і ў перабудову мы мелі магчымасць назіраць справядлівасць гэтай аксіёмы.

Беларуская мадэль паўстала не па капрызе яе непасрэдных стваральнікаў. Музыку, як геніяльна заўважыў Чайкоўскі, піша народ, роля кампазітараў абмяжоўваецца аранжыроўкай. Таму неабходна памятаць, што эканоміка, заснаваная на пераразмеркаванні рэсурсаў, — толькі форма, з дапамогай якой выяўляе сябе архаічнае грамадства, няздольнае да ўзнаўлення ў рынкавых умовах.

На афіцыйнай мове пераразмеркаванне ў нас прынята называць «моцнай сацыяльнай палітыкай». Яна — асноўны фактар стабільнасці ў краіне. Рэйтынг АП — важны элемент стабільнасці. Са снежня па верасень ён зменшыўся з 53 да 20,5% (па дадзеных НІСЭПД). Сам АП з падобнай дынамікай не пагадзіўся, адначасова ён выказаў вельмі арыгінальны погляд на прыроду ўласнай легітымнасці: *«Вранье полное, что у Лукашенко рейтинг падает, что белорусы его не любят. За что не любят? Разве я страну не люблю?»*

Вось яно як! Высвятляецца, што для атрымання грамадскай падтрымкі цалкам дастаткова любіць краіну. Стан эканомікі ніякай ролі пры гэтым не адыгрывае. Але ці пагодзіцца з такой трактоўкай «большасць»? Курс на новую эканамічную палітыку, абвешчаны ўрадам, не пакідае ёй шанцаў на выжыванне. Што да «меншасці», то і ў спрыяльныя гады прычын любіць АП у яе не было.

АЭС

# НІ БЯСПЕКІ, НІ АЛЬТЭРНАТЫВЫ

Вольга ХВОІН

**Для Беларусі будаўніцтва атамнай станцыі не вырашае праблему залежнасці ад Расіі ў пастаўцы энергарэсурсаў. Апроч таго, АЭС закрые магчымасці для развіцця альтэрнатыўнай энергетыкі.**

«Я не зразумеў матывацыю Беларусі ў намеры пабудаваць АЭС. Вы з адной залежнасці трапляеце ў іншую», — заявіў падчас панельнай дыскусіі ў Мінску аб міфах ядзернай энергетыкі Герд Розенкранц — кандыдат прыродазнаўчых навук, інжынер, кіраўнік інфармацыйнага аддзела нямецкага саюзу па ахове навакольнага асяроддзя. — Калі вы хочаце пабудаваць два блокі, гэта пакрые амаль палову спажывання. І тым самым вы фактычна зачыніце дзверы для альтэрнатыўнай энергетыкі. Самая танная энергія — тая, якую вы не спажываеце. Таму трэба скіраваць высілкі на эфектыўнае спажыванне».

Герд Розенкранц таксама прэзентаваў у Мінску кнігу «Міфы атамнай энергетыкі». Адзін з аўтараў выдання зазначыў, што «пасля падзей на «Фукусіме», аргументы, якія прыведзеныя ў кнізе, выглядаюць яшчэ больш правільнымі». «Калі ў 1970-я гады я пачаў выступаць супраць атамнай энергетыкі, то гаварылі, што вялікія катастрофы будуць раз на сто гадоў. А цяпер мы маем тры вялікія катастрофы цягам ста гадоў», — гаворыць спадар Розенкранц.

Ён нагадаў, што Германія, якая ад 1960-х гадоў выкарыстоўвае атамную энергію, сёлета вырашыла адмовіцца ад яе да 2022 года. Сёлета ўжо было выведзена з эксплуатацыі восем рэактараў. Дарэчы, пакуль не вырашана пытанне, чым жа Германія заменіць ядзерную энергетыку, аднак спецыялісты вялікія спадзяванні ўскладаюць менавіта на аднаўляльныя крыніцы. Так, за апошнія дванаццаць гадоў доля аднаўляльнай энергетыкі ў вытворчасці электраэнергіі павялічылася ў чатыры разы.

У грамадскай дыскусіі ўдзельнічалі і прадстаўнікі Мінэнерга, якія спрабавалі адстойваць сваю пазіцыю, апелюючы да вядомых тэзаў. «Вакол нас усе краіны маюць намер пабудаваць атамныя станцыі. Чаму Беларусь мусіць заставацца збоку ад сусветных тэндэнцый? — паведаміў кансультант дэпартамента па ядзернай энергетыцы Мінэнерга Міхаіл Пігулеўскі. — У нас 95 працэнтаў энергіі выпрацоўваецца з прыроднага газа, цана на які ўвесь час павялічваецца. Да таго ж у свеце ёсць універсальная формула — нельга прывязвацца да адной крыніцы энергіі, мусіць быць дыверсіфікацыя. Але якімі ўласнымі рэсурсамі мы валодаем? Мы прааналізавалі аднаўляльныя рэсурсы энергіі ў Беларусі, рэспубліка не адмаўляецца ад таго, каб выкарыстоўваць зялёную энергію. Ёсць праграма па будаўніцтву на рэках ГЭС, але яны будуць невялікай магутнасці, таму не змогуць пакрыць усе патрэбы. Што тычыцца аварыі на «Фукусіме», дык чалавецтва цяпер проста задумалася, як зрабіць гэту генерацыю больш бяспечнай».

Але з гэтым не згодны Розенкранц: «Рэактары не будуюцца па ўсім свеце, а толькі там, дзе дзяржаўная дактрына мае ядзерны складнік, — Кітай, Карэя, Індыя, Расія. У астатніх выпадках маем адзінкавыя будоўлі. У Фінляндыі, напрыклад, будуюць рэактар, які мусілі ўвесці ў строй у 2009 годзе, але адсунулі гэтую дату на 2013 год, ды і кошт праекту павялічыўся з трох да пяці мільярдаў еўра. Што тычыцца памежных з Беларуссю дзяржаў, то я перакананы, што там будуць падключаны толькі адна ці дзве АЭС, а астатнія так і застануцца марамі».

Прафесар, фізік Георгій Лепін з'яўляецца праціўнікам будаўніцтва АЭС. Ён гаворыць, што цяпер ёсць вялікая пагроза таго, што аварыі на АЭС могуць быць часцімі, бо ва ўсім свеце дзеля эканамічных выгодаў павялічваецца тэрмін эксплуатацыі станцый.

«Даследаванні ўплыву нейтроннага патоку на крышталічную рашотку металаў паказалі, што ён выклікае з'яўленне пор, адпаведна, павялічваецца верагоднасць разбурэння металу канструкцыі з павелічэннем тэрмінам эксплуатацыі станцый. І пакуль не адбудзецца некалькі сур'ёзных аварый, гэтыя тэрміны будуць падаўжаць. Увогуле, ніводны атамны рэактар сябе не акупіў у праектнай эксплуатацыі, калі не падтасоўваць лічбы, не карыстацца бюджэтнымі сродкамі, — гаворыць Лепін. — І з японскай катастрофай пакуль не ўсё зразумела. Японцы мяркуюць, што наступствы аварыі на Фукусіме будуць большыя, чым ад аварыі на ЧАЭС. Над рэактарамі Фукусімы задоўга да таго, як туды дабралася цунамі, з'явіўся газ крыптон, то бок для тэхнагеннай катастрофы хапіла і землятрусу. Акадэмік Лягасаў гаварыў, што пасля 2000 года будзе лавінападобнае змяненне клімату, і мы гэта бачым цяпер на кожным кроку».

Прафесар Лепін раскрытыкаваў і разлікі праектоўшчыкаў трываласці канструкцый будучай АЭС у выпадку магчымага падзення самалёту на станцыю: «Літоўцам на іх запыты адказалі, што двайны каўпак вытрымае падзенне самалёта масай да 10 тон, што рухаецца з хуткасцю 300 кіламетраў на гадзіну. Дзе вы бачылі такі сучасны самалёт? Калі я задаў такое пытанне прадстаўніку Мінпрыроды, то ён сказаў, што вось ляціць самалёт, і ў яго адвальваецца рухавік, і падзенне рухавіка каўпак вытрымае».

Аргумент, што ў атамнай энергетыкі няма альтэрнатываў, аспрэчвае і эколаг Таццяна Новікава. «Атамная энергетыка ў свеце ў электрагенерацыі займае 6–8 працэнтаў. Гэта аспрэчвае думку, што ў атамнай энергетыкі няма альтэрнатывы».

Цікава, што Міхаіл Пігулеўскі адмовіўся называць эканамічныя падрабязнасці праекту беларускай АЭС, спаслаўшыся на камерцыйную таямніцу. «У нас няма магчымасці будаваць неакупальныя праекты ці непрыбытковыя для бізнэса. Назаву лічбы з бізнэсплана інвестыцыйнага праекта: сабекошт энергіі — 4,22 цэнта кВт у гадзіну, тэрмін акупальнасці — 18,9 года. За гэты час мы разлічваем выйсці на станоўчую рэнтабельнасць».

Варта заўважыць, што сама дыскусія на тэму будаўніцтва АЭС у Беларусі з удзелам прадстаўнікоў міністэрства энергетыкі і грамадскасці была даволі цяжкай: апанентам было няпроста пачуць адзін аднаго ды трымацца вызначанага рэгламенту — даецца ў знакі шматгадовая практыка самаізаляцыі дзяржструктур ад беларускага грамадства і пэўная апатыя апошняга да падзей, што адбываюцца ў краіне. «Давайце больш часта сустракацца, — заявіла напрыканцы сустрэчы прадстаўніца Мінэнерга Лілія Дулінец. І панаракала на няўвагу людзей. — Прамая лінія з Мінэнерга наконт будаўніцтва АЭС была зладжана 28 кастрычніка, але на працягу гадзіны да нас не паступіла ніводнага пытання».




КАЛОНКА КАНСТАНЦІНА СКУРАТОВІЧА

# БЕСПРАЦОЎНЫХ ЦЯЖКА ПАЛІЧЫЦЬ



**Як адзначыў на прэсавай канферэнцыі першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Пётр Грушнік, паводле апошняга перапісу насельніцтва, беспрацоўнымі ў Беларусі з'яўляюцца 6,1% ад колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва.**

Да катэгорыі эканамічна актыўнага насельніцтва належаць людзі, якія маюць крыніцу самастойнага існавання ці намер яго атрымаць і маюць магчымасць працаваць. Такім чынам, крытэры даволі рухомыя. Жаданне зарабляць можа быць і ў дзяцей, і людзей, старэйшых за пенсійны ўзрост. Таму Міжнародная арганізацыя працы вызначыла, што эканамічна актыўным можа лічыцца насельніцтва ва ўзросце ад 10 да 72 гадоў. Дзеці і падлеткі, па традыцыі, працуюць у краінах трэцяга свету, а для жыхароў развітых краін характэрна вельмі працяглая працоўная актыўнасць.

Інакш кажучы, каб вызначыць колькасць эканамічна актыўнага насельніцтва, трэба праводзіць сацыялагічнае апытанне. У Беларусі да гэтага часу праблема вырашалася прасцей. Да лічбы занятых у эканоміцы дадавалі колькасць зарэгістраваных у службе занятасці беспрацоўных, і атрымлівалі патрэбны вынік. На канец 2009 года, калі праводзіўся перапіс, колькасць эканамічна актыўнага насельніцтва, згодна Белстату, складала 4696,9 тысячы чалавек (4655,5 тысячы занятых плюс 41,4 тысячы зарэгістраваных беспрацоўных).

Але, на самай справе, колькасць беспрацоўных, а значыць і эканамічна актыўнага насельніцтва ў цэлым, была большай амаль на 290 тысяч чалавек.

Менавіта такой ступені абвастрэння дасягнула ў нашай краіне сацыяльна-эканамічная хвароба — беспрацоўе. Але яна ніяк не фіксуецца дзяржавай, якая афіцыйна цешыцца мізэрнымі паказчыкамі афіцыйнага беспрацоўя 0,8% — у верасні 2010 года, 0,6% — у верасні гэтага. Хутка зачынім біржу працы!

Калі частцы афіцыйных беспрацоўных выплачваецца хоць нейкая дапамога (16,6% ад сярэднедушавога памеру бюджэту пражытачнага мінімуму), то абсалютная большасць беспрацоўных увогуле не мае ніякага дачынення ні да дзяржаўных інстытутаў, якія павінны рэгуляваць попыт і прапанову на рынку працы, ні да інстытутаў сацыяльнай абароны насельніцтва ўвогуле.

**15.50** Дакументальна-пазнавальны серыял «Бітвы дыназаўраў» (ЗША). 1-я серыя.
**16.50** Прэм'ера. «Бітва экстрасэнсаў».
**17.55** Меладраматычны серыял «Ты маё жыццё» (Аргенціна).
**18.55** Хакей. КХЛ.
**21.00** Калыханка.
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** КЕНО.
**21.30** Бітва экстрасэнсаў.
**22.35** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**23.30** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ.

РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Даярка з Хацапетаўкі-3».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.35** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.50** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** «Прамы эфір».
**21.35** Прэм'ера. «Юрмала - 2011». Фэст гумарыстычных праграм.
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** Прэм'ера. Фільм «Як жа быць сэрцу». 2010 г.

НТВ

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «І зноў добры дзень!».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Вочная стаўка».
**11.15** «Да суду».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.25** «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
**15.10** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**21.25** Дэтэктыўны серыял «Пятніцкі».
**23.10** «Казнакрады».
**00.00** Дэтэктыўны трылер «База «Клейтан».

EUROSPORT

**10.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Часопіс.
**11.00** Конны спорт. Агляд тыдня. Часопіс.
**11.30** Футбол. Эўра-2012. Агляд матчаў.
**12.30** Футбол. Эўра-2012. Агляд матчу.
**13.15** Футбол. Эўра-2012. Агляд матчу.
**14.00** Футбол. Эўра-2012. Агляд матчаў.
**15.00** Футбол. Кубак свету ФІФА - 2014. Бразілія. Кваліфікацыя. Агляд.
**16.00** Фігурнае катанне. Гран-пры. NHK Трофі. Пары. Кароткая праграма.
**17.00** Live. Фігурнае катанне. Гран-пры. Пары. Кароткая праграма (Францыя).
**18.15** Live. Фігурнае катанне. Гран-пры. Мужчыны. Кароткая праграма (Францыя).
**19.45** Фігурнае катанне. Гран-пры. Пары. Кароткая праграма (Францыя).
**20.45** Live. Фігурнае катанне. Гран-пры. Жанчыны. Кароткая праграма (Францыя).
**22.00, 22.30** Цімберспорт. Чэмпіянат свету. Нідэрланды.
**23.00** Live. Бокс. Германія.
**01.00** Самыя моцныя людзі планеты. Турнір Giants Live. Кіеў (Украіна).
**01.30** Самыя моцныя людзі планеты. Турнір Giants Live. Кіеў (Украіна).
**02.00** Фігурнае катанне. Гран-пры. Жанчыны. Кароткая праграма (Францыя).
**03.00** Аўтаспорт. Акадэмія GT. Часопіс.
**03.15** Вось дык так!!!
**03.30** Тэхнічны перапынак.

БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** Басанож па свеце.
**08.00** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 1 серыя.
**08.45** Рэпартэр.
**09.15** «Сонечная дзіда», серыял: 12 серыя.
**09.40** «Euromaxx».
**10.10** «Ліст з Малдовы», дак. фільм, 2009 г., Румынія.
**10.35** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**10.45** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Правінцыя», дак. фільм, 2009 г., Расія.
**11.30** Эксперт.
**11.55** Басанож па свеце.
**12.20** «Новенькая», дэтэктыўны серыял: 8 серыя.
**13.05** «Euromaxx».
**13.35** «Сонечная дзіда», серыял: 12 серыя.
**14.00** «Ліст з Малдовы», дак. фільм, 2009 г., Румынія.
**14.30** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 1 серыя.
**15.20** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**15.45** МакраФон: «Права быць свабодным» (канцэрт альтэрнатыўнай музыкі Луцк-2007): ч. 2, выступ гурта «Індыга».
**16.15** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Правінцыя», дак. фільм, 2009 г., Расія.
**17.00** «Між намі, буслямі», мультсерыял для дзяцей: 11 серыя.
**17.25** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**17.30** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Новенькая», дэтэктыўны серыял: 8 серыя.
**18.50** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.05** Маю права.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар.
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** Еўропа сёння.
**20.25** Невядомая Беларусь: «Пастка для апазіцыі», дак. фільм, 2011 г., Беларусь.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**21.50** Форум (ток-шоу).
**22.35** «Дзеці і рыбы», маст. фільм, 1997 г., Польшча.
**00.10** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**00.20** Аб'ектыў.
**00.45** Гарачы каментар.

## 19 ЛІСТАПАДА, СУБОТА

**06.35** Існасць.
**07.00** Добрай раніцы, Беларусь!
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** Ранішняя хваля.
**09.45** Скрынка перадач.
**10.20** Культурныя людзі.
**10.55** Меладрама «Усё золата свету…» (Расія). 1-я серыя.
**12.10** Камедыя «Сем нянек» (СССР).
**13.45** Тэлефільм АТН «Планета гольфу: Украіна».
**14.15** Вакол планеты.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**15.55** Эксцэнтрычная камедыя «Вар'яцкія грошы» (ЗША-Германія).
**17.45** «Тармазны шлях». Адмысловы рэпартаж АТН.
**18.00** Ваша лато.
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.15** «Славянскі базар-2011».
**21.00** Панарама.
**21.50** Дэтэктыўны трылер «Спіс кантактаў» (ЗША).
**23.45** Міжнародны музычны фэст «Крым Мюзік Фэст».
**01.10** Дзень спорту.

---

**07.00** «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**09.05** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**09.45** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** «Разумніцы і разумнікі».
**11.55** «Планета 51». Анімацыйны фільм.
**13.20** «Розыгрыш». Лепшае.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Прэм'ера. «Андрэй Мягкоў. І ніякай ірoніі лёсу..».
**17.20** Прэм'ера. «Адмысловае заданне».
**18.40** «Адзін супраць усіх».
**19.25** «Абмен жонкамі».
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Балеро».
**22.45** «Пражэктарпэрысхілтан».
**23.25** Фільм «Запавет».

---

**07.00** Мультыплікацыйныя фільмы.
**07.30** «Анфас».
**07.45** «Салдаты. Дзембельскі альбом». Серыял.
**09.35** «Чыстая праца».
**10.20** «Мінск і мінчане».
**10.55** Фільм «Неўважлівы». Францыя, 1970 г.
**12.30** «Прыгоды дылетанта».
**13.00** «Ваенная таямніца».
**13.55** Чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па футболе. Прамая трансляцыя.
**16.00** «Рэпарцёрская гісторыі».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.40** Фільм «На мурамскай дарожцы». Расія - Германія - Карэя Паўднёвая, 1993 г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** Фільм «Граф Монтэ - Крыста». ЗША - Вялікабрытанія - Ірландыя , 2002 г.
**22.35** «Зорны рынг».
**23.50** «Покер дуэль».
**00.40** Фільм «Чалавек, які занадта мала ведаў». ЗША - Германія,1997 г.
**02.10** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

---

**06.45** Меладрама «Форэст Гамп» (ЗША).
**09.15** Дабравест.
**09.40** Мір вашай хаце.
**09.50** Пра мастацтва.
**10.20** Жансавет.
**11.00** Кулінарная праграма «Ясі і худзей».
**11.40** Школа рамонту.
**12.45** Прэм'ера. «Інтуіцыя». Шоў-праграма.
**13.50** Серыял «Маргоша» (Расія).
**15.55** Гандбол. Чэмпіянат Беларусі. Прамая трансляцыя.
**17.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Манчэстэр Сіці - Ньюкасл. Прамая трансляцыя.
**19.55** Бітва экстрасэнсаў.
**21.00** КЕНО.
**21.05** Меладрама «Форэст Гамп» (ЗША).
**23.40** Шоў-праграма «Інтуіцыя» (Расія).

РОССИЯ

**07.00** Фільм «Як жа быць сэрцу». 2010 г.
**08.40** «Юрмала - 2011». Фэст гумарыстычных праграм.
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.15** «Суботнік».
**11.50** Дэтэктыў «Шпік Пецярбургскай паліцыі».
**13.30** «Відавочнае-неверагоднае».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Сумленны дэтэктыў».
**14.45** Прэм'ера. «Міхайла Ламаносаў. Дзесяць навэл з жыцця генія».
**15.45** Камедыя «Салдат Іван Броўкін».
**17.25** «Суботні вечар».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.40** Прэм'ера. Фільм «Зязюля». 2010 г.
**00.05** «Дзяўчаты».

НТВ

**07.35** «Агляд».
**08.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**08.20** «Медыцынскія таямніцы».
**08.50** «Акадэмія прыгажосці».
**09.25** «Гатуем».
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.20** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Дарожны патруль-4».
**15.10** «Жаночы погляд».
**16.20** «Таямнічая Расія».
**17.20** «Вочная стаўка».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.00** «Праграма Максімум».
**21.05** «Руская сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**22.05** «Ты не паверыш!».
**23.05** «Апошнія словы». Вострасюжэтнае ток-шоў.
**00.05** Прэм'ера. Фільм «Квартал».

EUROSPORT

**10.30** Вось дык так!!!
**10.45** Футбол. Эўра-2012. Агляд матчаў.
**11.45** Еўраспорт. Пад грыфам «сакрэтна». Часопіс.
**12.15** Фігурнае катанне. Гран-пры. Абавязковы танец. Парыж (Францыя).
**13.30** Live. Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны. 10 км вольным стылем.
**14.30** Фігурнае катанне. Гран-пры. Мужчыны. Кароткая праграма (Францыя).
**15.15** Live. Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны. 15 км вольным стылем.
**16.15** Фігурнае катанне. Гран-пры. Пары. Адвольная праграма. Парыж (Францыя).
**17.30** Live. Фігурнае катанне. Гран-пры. Мужчыны. Адвольная праграма (Францыя).
**19.00** Фігурнае катанне. Гран-пры. Пары. Адвольная праграма. Парыж (Францыя).
**19.45** Фігурнае катанне. Гран-пры. Жанчыны. Кароткая праграма (Францыя).
**20.30** Live. Фігурнае катанне. Гран-пры. Жанчыны. Адвольная праграма (Францыя).
**22.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
**23.00** Live. Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
**01.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны. 10 км вольным стылем.
**01.45** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны. 15 км вольным стылем.
**02.30** Фігурнае катанне. Гран-пры. Жанчыны. Адвольная праграма (Францыя).
**03.15** Live. Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Размінка. Макао (Макао).
**03.30** Тэхнічны перапынак.

БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** «Новенькая», дэтэктыўны серыял: 8 серыя.
**08.20** «Між намі, буслямі», мультсерыял для дзяцей: 11 серыя.
**08.45** Калыханка для самых маленькіх.
**09.15** Невядомая Беларусь: «Пастка для апазіцыі», дак. фільм, 2011 г., Беларусь.
**09.45** Еўропа сёння.
**10.10** ПраСвет.
**10.35** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**11.00** Форум (ток-шоу).
**11.50** Вагон.
**11.55** «Між намі, буслямі», мультсерыял для дзяцей: 11 серыя.
**12.20** Калыханка для самых маленькіх.
**12.45** Невядомая Беларусь: «Пастка для апазіцыі», дак. фільм, 2011 г., Беларусь.
**13.20** Еўропа сёння.
**13.45** ПраСвет.
**14.10** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**14.35** «Дзеці і рыбы», маст. фільм, 1997 г., Польшча.
**16.10** Форум (ток-шоу).
**17.00** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 4 серыя.
**17.45** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** Чаму дэмакратыя? 9 серыя: «Крывавыя карыкатуры».
**19.00** Зона «Свабоды».
**19.30** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.25** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнавальная праграма).
**20.30** Беларускія лёсы: «Людзі старой веры», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Два на два (тэледыскусія).
**21.40** Суботні сеанс: «Кошт ейнага раману», трымценнік, 1996 г., ЗША.
**23.10** «Трэці афіцэр», дэтэктыўны серыял: 12 серыя.
**00.00** Аб'ектыў.

## 20 ЛІСТАПАДА, НЯДЗЕЛЯ

### Першы канал

**06.30** Міжнародны музычны фэст «Крым Мюзік Фэст».
**07.50** Усё як мае быць!
**08.20** «Дажынкі ў Маладзечне». Відэафільм.
**09.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**09.10** Арсенал.
**09.40** «Медычныя таямніцы».
**10.20** Да цешчы на бліны.
**10.55** Серыял «Усё золата свету…» (Расія). 2-я серыя.
**12.10** Камедыя «Шчыра Ваш…» (СССР).
**13.50** Мультфільм.
**14.15** Клуб рэдактараў.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Тэлефільм АТН «Лісты з Берастаўцы» цыклу «Зямля беларуская».
**15.45** Дакументальны серыял «У пошуках скарбаў» (ЗША).
**16.35** Хакей для ўсіх.
**17.20** Цыкл дакументальных тэлефільмаў «Дыялог аб цывілізацыях».
**17.45** Канцэртная праграма.
**18.20** Суперлато.
**19.10** Камедыйны баявік «Дом вялікай матулі-2» (ЗША).
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА.
**22.30** Псіхалагічная драма «Гарбатая гара» (ЗША-Канада).

### АНТ

**07.00** «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь (з субтытрамі).
**09.20** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.10** Прэм'ера. «Жыццё ў служэнні».
**12.10** АНТ прадстаўляе: «Брэйн-рынг».
**13.10** Камедыя «Службовы раман».
**16.00** Нашы навіны (з субытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Асяроддзе пасялення.
**17.25** «Эстрадны кактэйль».
**18.40** АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў».
**20.00** Контуры.
**21.05** «Дыханне планеты».
**21.40** Фільм «Дзікая штучка».
**23.30** Прэм'ера. Фільм «Амерыканец».

### СТВ

**07.10** «Салдаты. Дзембельскі альбом». Серыял.
**09.00** «Аўтапанарама».
**09.30** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.20** «Вялікі сняданак».
**11.00** Фільм «Граф Монтэ - Крыста «. ЗША - Вялікабрытанія - Ірландыя , 2002 г.
**13.20** «Добры дзень, доктар».
**13.55** Фільм «За запалкамі». Фінляндыя - СССР, 1979 г.
**15.45** Ток-шоў «Такі лёс».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Праўда».
**17.30** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Добры». Германія - Вялікабрытанія, 2008 г.
**22.30** Змяшаныя адзінаборствы. Міжнародны турнір Гран Пры.
**00.00** Фільм «Боль чужых сэрцаў». Італія, 2005 г.
**02.00** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

### Беларусь 2

**07.15** «Аперацыя «Ы» і іншыя прыгоды Шурыка» (СССР).
**08.55** Таямніца душы.
**09.20** Прыступкі Веры.
**09.35** Гаспадар.
**10.05** Цела чалавека.
**10.45** «Ясі і худзей». Кулінарная праграма.
**11.20** Школа рамонту.
**12.30** «Інтуіцыя». Шоў-праграма (Расія).
**13.35** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**13.55** Хакей. КХЛ. Прамая трансляцыя.
**16.25** Кінаспробы.
**17.05** Каханыя камедыі. «Аперацыя «Ы» і іншыя прыгоды Шурыка» (СССР).
**18.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Чэлсі - Ліверпуль. Прамая трансляцыя.
**21.00** Спортлато 5 з 36.
**21.05** КЕНО.
**21.10** Навіны надвор'я.
**21.45** Камедыя «Карты, грошы, два ствала» (Вялікабрытанія).
**23.45** «Інтуіцыя». Шоў-праграма (Расія).

### РОССИЯ

**07.00** «Уся Расія».
**07.15** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**07.40** Фільм «Зязюля». 2010 г.
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** Фільм «Закаханы па ўласным жаданні».
**13.45** «ХА». Маленькія камедыі.
**14.00** Весткі.
**14.15** «З новай хатай!».
**14.45** «Л.Сакалова. Свая тэма».
**15.30** Прэм'ера. «Шлях Пастыра».
**16.20** Камедыя «Іван Броўкін на цаліне».
**18.10** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**20.00** Весткі тыдня.
**21.05** Прэм'ера - 2011. «Стылягі-шоў».
**22.55** 1/2 фіналу Вышэйшай лігі КВЗ РБ.

### НТВ

**07.35** «У зоне адмысловай рызыкі».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Першая перадача».
**08.45** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Выратавальнікі».
**10.55** «Дачны адказ».
**12.20** «Развод па-руску».
**13.00** Сёння.
**13.20** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Дарожны патруль-4».
**15.05** «ГРУ. Таямніцы ваеннай выведкі».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Следства вялі…».
**17.20** «І зноў добры дзень!».
**18.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.50** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**21.55** «Таемны шоў-бізнэс».
**22.55** «Нтвшнікі». Арэна вострых дыскусій.
**23.55** Фантастычны трылер «Кодэр».

### EUROSPORT

**06.00** Live. Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Раўнд 23. Макао (Макао).
**07.00** Live. Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Раўнд 24. Макао (Макао).
**08.00** Тэхнічны перапынак.
**10.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Раўнд 24. Макао (Макао).
**11.30** Фігурнае катанне. Гран-пры. Адвольны танец. Парыж (Францыя).
**12.45** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны. 10 км вольным стылем.
**13.30** Live. Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны. 4x5 км. Эстафета.
**14.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны. 15 км вольным стылем.
**15.15** Live. Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны. 4x10 км. Эстафета.
**17.00** Live. Фігурнае катанне. Гран-пры. Паказальны выступ. Парыж (Францыя).
**18.45** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Раўнд 24. Макао (Макао).
**19.45** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны. 4x10 км. Эстафета.
**21.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны. 4x5 км. Эстафета.
**22.00** Бокс. Турнір Bigger's Bettre.
**23.30** Матаспартыўны часопіс.
**23.45** Снукер. Турнір PTC. Антвэрпэн (Бельгія). Дзень 3-і.
**01.15** Фігурнае катанне. Гран-пры. Паказальны выступ. Парыж (Францыя).
**02.30** Матаспартыўны часопіс.
**02.45** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны. 4x5 км. Эстафета.
**03.45** Тэхнічны перапынак.

### БЕЛСАТ tv

**07.00** Аб'ектыў.
**07.15** Зона «Свабоды».
**07.45** На колах.
**08.15** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 4 серыя.
**09.00** Калыханка для самых маленькіх.
**09.30** Прыватная калекцыя.
**10.00** Беларускія лёсы: «Людзі старой веры», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**10.25** ПраСвет.
**10.50** Чаму дэмакратыя? 9 серыя: «Крывавыя карыкатуры».
**11.45** ПраСвет.
**12.05** «Трэці афіцэр», дэтэктыўны серыял: 12 серыя.
**12.55** Два на два (тэледыскусія).
**13.20** На колах.
**13.45** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 5 серыя.
**14.35** Калыханка для самых маленькіх.
**15.00** Беларускія лёсы: «Людзі старой веры», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**15.25** «Кошт ейнага раману», трымценнік, 1996 г., ЗША.
**17.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.15** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 2 серыя.
**18.00** Два на два (тэледыскусія).
**18.25** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**18.40** «Ваенныя гульні», дак. фільм, 2009 г., Польшча: 2 серыя.
**19.25** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** Дакументальная гадзіна: «Уяго забралі каханне», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**20.45** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.40** Эксперт.
**22.10** Фільматэка майстроў: «Ітан Фроўм», маст. фільм, 1993 г., ЗША.
**23.45** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**00.00** «Тыдзень у «Аб'ектыве».
**00.40** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).

## Шаноўныя чытачы!

**На жаль, газету «Новы час» немагчыма набыць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час» і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца магчыма на любую колькасць месяцаў, аформіўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: **рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ААО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

Акрамя таго падпісацца можна ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў:

Магілёў: (8 029)) 604 34 57, Юрый;
Мінск: (8029) 178 31 68 Вольга;
Бабруйск: (8029) 628 75 01 Вольга;
Слуцк: (8044) 755 66 48 Марына.

БЕЛПОЧТА ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ____
почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ____

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

### Паважаныя чытачы!

Падпісны кошт аднаго нумара газеты 750 руб. аднаго месяца — 3000 руб.

«Новы час» запрашае да супрацоўніцтва распаўсюджвальнікаў газеты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

**Даведка па тэл: (8 029) 651 21 12.**

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739
УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик
Пеня ______
Кассир Всего ______

**Для тых, хто прымае рашэнні!**
Новы час
www.novychas.org

ДАКУМЕНТАЛЬНЫ НАРЫС

# ЛЯЛЬКІ З ДЗЯВОЧЫХ КОСТАК

Андрэй РАСІНСКІ

**7 лістапада мяне выпадкова знайшла навіна: расійская паліцыя арыштавала вядомага ніжагародскага навукоўца і краязнаўцу Анатоля Масквіна. Уначы той пракрадаўся на могілкі і цягаў парэшткі. З дзявочых костак ён зрабіў 29 лялек у чалавечы рост. Лялькі былі ўпрыгожаныя святочным магільным адзеннем.**



Калісьці лёс зводзіў мяне з гэтым чалавекам. Дзеі, што выкрыліся ў Ніжнім Ноўгарадзе, настолькі шокавыя, што я абавязаны звярнуцца да ўласнай памяці — каб хоць нешта ўцяміць. І я дасюль не магу даць веры, што гэта было.

Першы ўспамін, які тычыцца справы, — вялізная чарга, што цягнецца з Аляксандраўскага саду да Чырвонай плошчы. Суворыя людзі. Маркота. Цішыня. Трое падшыванцаў, якія ў Маскве праездам на пару гадзінаў, спрабуюць уцерціся ў самую галоўную ў савецкай краіне чаргу, перабежкамі набліжаючыся да яе галавы. Не атрымалася: афёра была выкрытая пільнымі міліцыянтамі, а халяўнікі так і не пабачылі «дзядулю Леніна» ў дамавіне.

Тонкімі галасамі спяваюць аднакласнікі:

«*У Маўзалея часавыя нязменна дзень і ноч стаяць,*

*У Маўзалея часавыя бяссмерце Леніна храняць*».

Я так і не дазнаўся, як выглядае гэты бессмяротны жыўцом, але ягонае забальзамаванае цела — аб'ект нязломнага культу. Запытайце адданага камуніста аб захаванні правадыра — і ўбачыце трупамана. Ён будзе крычаць, біцца аб вечка сваёй мазгавой труны, абы не дапусціць, каб пахавалі сакральнае цела куміра.

А яшчэ я памятаю лядашчага Брэжнева, які ледзьве стаіць на свяце «Вялікай Сацыялістычнай Кастрычніцкай рэвалюцыі» на трыбуне маўзалея, у якім (пад нагамі генеральнага сакратара і ўсяго палітбюро) ляжыць аўтар крылатай фразы «Імперыялізм гніе жыўцом».

Беларускае свята Кастрычніцкай рэвалюцыі, за якім улады захавалі статус дзяржаўнага (ці не адзіныя з усіх краін былога СССР) — гэта свята некрафіліі. Такім гэта савецкае свята было заўжды: за фасадам «перадавой навукі», «навуковага атэізму» і матэрыялістычнага шчасця для «прагрэсіўнага чалавецтва» — ляжаў забальзамаваны труп у шкляным саркафагу.

Я мушу распавесці пра героя гэтага нарыса, з якім сутыкнуўся амаль 20 гадоў таму. Ён жыў у суседнім пакоі ва ўніверсітэцкім інтэрнаце; на некалькі пакояў была агульная кухня.

— З Беларусі? Кандрат Крапіва яшчэ жывы?

— Не.

— Шкада. У яго ёсць карысная паэма «Хвядос — Чырвоны нос» пра п'яніцу, які самазасціртаваўся, і яму пакланяліся, як машчам. І я не кажу ўжо пра ягоную сатырычную «Біблію».

Анатоль не лічыўся экспертам па Беларусі; ён займаўся гальскай і стараанглійскай мовамі; таксама лёгка размаўляў на нямецкай, польскай, французскай. Агульная кольказсць моваў, якімі ён валодаў, перавальіла за дзясятак. І спыніцца на дасягнутым ён не збіраўся.

Зрэшты, не кожны беларускі філолаг здольны быў пахваліцца глыбокім веданнем Крапівы. Але, бадай, не было ніводнага пытання, па якім Анатоль не здолеў бы прачытаць лекцыю. Часта мы з суседзямі забаўляліся: «А давайце прыдумаем яму тэму — змеі Мадагаскара».

— Змеі Мадагаскара? — і гучала падрабязная гісторыя пра віды і колеры змей, пра іхнюю атруту і іх звычкі.

Але з яшчэ большай ахвотай паліглот распавядаў пра сярэднявечныя ерасі: усялякія багумілы, катары, паўлікіяне, пелагіяне шыпелі, поўзалі, лезлі ў вокны і біліся ў дзверы.

— Увогуле, я сатаніст, — абвяшчаў Анатоль.

Але яму не вельмі і верылі: злавесны вобраз сатаніста не стасаваўся з натхнёным дзіваком у бамжаватым прыкідзе; дзівак гэны цягаў кнігі, якія мусяць быць знішчанымі (з трафейным штампікам Рэйхсканцылярыі), песціў зжаўцелыя падшыўкі газет, выкінутыя на сметніцу, і дэманстратыўна блюзнерыў.

Яшчэ большае непаразуменне выклікала ягоная дактрына сатанізму. За выняткам зацятых праклёнаў у адрас Бога, гэты сатанізм амаль ні ў чым не адрозніваўся ад грубага матэрыялізму, што насаджаўся ў савецкіх школах.

— Ці ёсць жыццё пасля смерці?

— Разрый магілу і паглядзі: нічога там няма.

— Ці ёсць Бог?

— Няма. Але мы змагаемся з ідэяй бога як шкоднай.

— Ці ёсць д'ябал?

— Ёсць. У кожнай кропцы матэрыі. І рух ідзе ад кепскага да найгоршага.

Сатаніст высока падняў відэлец і адпусціў яго.

— Вось механічны закон прыроды. Нічога боскага тут быць не можа. Дзе тут бог? Наадварот — ёсць закон. І ёсць дэманізм у кожнай кропцы.

Мяне перасмыкнула.

— Ці ёсць любоў?

— Няма. Бо, калі мы прызнаем існаванне любові, то будзем вымушаныя прызнаць існаванне душы, а, прызнаўшы існаванне душы, будзем вымушаныя прызнаць існаванне яе творцы — Бога. А калі Бога няма, згодна з нашай дактрынай, то няма ні душы, ні кахання.

У секты былі кнігі, якія быццам перапісваліся са старажытных часоў, адэпты завучвалі іх на памяць. Члены секты маглі ліставацца і шыфрамі. Сеціва сплягалася шчыльнае: савецкія рэлігіязнаўцы-бязбожнікі (кшталту Емяльяна Яраслаўскага) пераймалі эстафету забытых нямецкіх паэтаў, а тыя, у сваю чаргу, вялі радавод ад катараў і гностыкаў.

Каб інтэлектуальнаму сатаністу распазнаць такога ж, варта працытаваць завучаны радок — і пачуць працяг.

— Мы былі вымушаныя некаторыя тэксты вывесці з ужытку, бо іх засвечвалі, — скардзіўся Анатоль. У «Казцы вандраванняў» ёсць шыкоўны дыялог, дакладней палова ягоная. Адмовіліся!

Я паехаў да свайго настаўніка, які ведаў пра фільмы амаль усё. Але мы не знайшлі ў карціне нічога падазронага.

З інтэрнату я сыходзіў. Сатаніст выклікаўся праводзіць мяне.

Раптам ён знік. Мне падумалася: знайшоў новы пачак газет на сметніцы. Але Анатоль аб'явіўся зноў.

Твар у яго быў шкадлівы і задаволены.

На чорным муры бялела свежанашкрабанае: «Праваслаўная царква — ганьба Расіі!»

— Ну што за глупота! Разумны чалавек, а…

Анатоль хмыкнуў.

— Дарэчы, з гэтымі вашымі таемнымі кнігамі нейкая лухта атрымліваецца, — папікнуў я сектанта.

— А няўжо ты думаў, што я выдам сакрэтныя звесткі? Хочаш прачытаць іх — уваходзь у шэрагі, — ялейным голасам сказаў Анатоль. — Я магу скласці ліст да мінскае фратрыі.

— Ніколі.

— Як хочаш. Але, мне здаецца, мы яшчэ пабачымся.

Я так не думаў.

Імперыя канала; я вярнуўся ў Мінск. Гэта сустрэча пакрысе забывалася.

Але 2 лістапада, калі ў Беларусі памінаюць памерлых і святло ад запаленых агеньчыкаў разганяе цемру, расійская паліцыя арыштавала вядомага ніжагародскага краязнаўцу. Уначы, як сцвярджае паліцыя, навуковец Анатоль Масквін пракрадаўся на могілкі — і цягаў парэшткі. З дзявочых костак ён зрабіў 29 лялек у чалавечы рост і хаваў іх у душным пакойчыку. Лялькі былі ўпрыгожаныя святочным магільным адзеннем.

Панятых папярэдзілі — каб яны не згубілі прытомнасць. Але раней студэнткі спакойна здавалі іспыты ў кампаніі трупаў-цацак. На допыце абвінавачаны, які за два апошнія гады зацята каталагізаваў 752 тэрыторыі пахаванняў, абураўся: «Я не вандал. Праводзіў дома даследаванні і збіраўся паведаміць калегам пра новае навуковае адкрыццё». Целы вучоны муміфікаваў па адмысловых рэцэптах: адна мумія ажыла, калі да яе дакрануліся. Грудзі прапелі: «Мішка вельмі любіць мёд!»

Фанатык-магілазнаўца, які адмаўляў любоў, душу і Бога, укладаў у саладкія грудзі музычныя шкатулкі, плюшавыя сэрцы — і аскепкі магільных плітаў.

Я пазнаў яго па размытай фатаграфіі.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Беларусь, у адрозненні ад Казахстана, як месца для прыцягнення інвестыцый не вытрымлівае ніякай крытыкі. Сёння інвестары бягуць з яе хутчэй, чым нават з Расіі. Лукашэнка, не разумеючы асноў рынкавай эканомікі, спрабаваў навязваць сацыялістычныя прынцыпы размеркавання. Доўгі час ён існаваў на танных энергарэсурсах, якія пастаўляюцца з Расіі, плюс калій і сельская гаспадарка, і спрабаваў на гэтым выехаць. Але любая нярынкавая, папулісцкая палітыка, не заснаваная на эканамічным балансе, непазбежна прыводзіць да фатальных наступстваў. Сёння яна фактычна прывяла Беларусь да краху. Там усё накрылася, таму яны моцна зацікаўленыя ў такім аб'яднанні. Іх цікавяць не інвестары — ім хоць бы атрымаць у рамках Еўразійскага саюзу танную сыравіну і гарантаваныя пастаўкі энерганосьбітаў.

**«Известия» (Расія)**

Мімавольнае прызнанне А. Лукашэнкі ў тым, што «наперадзе ў нас могуць быць няпростыя часы», тлумачыць, чаму ў беларускім грамадстве стварэнне новай узброенай сілы пад кіраўніцтвам дылетантаў успрымаюць як падрыхтоўку да галодных бунтаў і грамадзянскай вайне. Палітолагі глядзяць далей — у дзеяннях прэзідэнта яны ўгледжваюць стымуляванне правакацый для развязвання грамадзянскай вайны. Звонку Беларусі ніхто не пагражае, пагроза для рэжыму сыходзіць выключна з эканамічнай сітуацыі ў рэспубліцы. Таму рашэнне А. Лукашэнкі можна разглядаць толькі як спробу перавесці эканоміку Беларусі на ваенныя рэйкі і такім чынам атрымаць поўную свабоду для закручвання гаек.

**«Биржевой лидер» (Расія)**

Важна зразумець, што рыторыка прымусу з боку Еўропы і ЗША контрпрадуктыўная, паколькі Лукашэнка не можа быць слабым перад сваімі падначаленымі. Варта яму толькі пагадзіцца і пайсці на выкананне якіх-небудзь умоў, яго імідж сярод падначаленых пагоршыцца. Таму не трэба ставіць яму ўмовы, загадзя ведаючы, што выканаць іх беларускі прэзідэнт не зможа. Трэба змяніць тон і ігнараваць Лукашэнку, не надаваць яму ўвагі, паколькі гэта толькі дадае яму балы ўнутры краіны. У той жа час іншы аналітык упэўнены, што ў дадзены момант беларускі прэзідэнт больш не можа балансаваць, у яго няма месца для манеўру на Захадзе. Цяпер ён ідзе да Расіі, прычым ён слабы ў дачыненнях з Расіяй, і робіць расіянам саступкі, паколькі ў яго няма выйсця. А калі ўлічыць складаную эканамічную сітуацыю, менавіта цяпер настае той момант, калі можна паспрабаваць штосьці змяніць у Беларусі, мяркуюць эксперты.

**Delfi (Літва)**

Эксперты аптымізму Лукашэнкі не падзяляюць, адзначаючы, што паміж саюзнікамі ідзе жорсткі гандаль, у Мінску мяркуюць, што на гэты раз Лукашэнку недастаткова будзе інтэграцыйнай рыторыкі для таго, каб атрымаць ад Масквы падтрымку. Ніякіх роўных умоў па коштах на энерганосьбіты не будзе. Адпаведна, наўрад ці бакі дасягнуць кансенсусу і па пытанню адзінай валюты. Праўда, ёсць у Мінску і эксперты, якія лічаць, што ў Лукашэнкі на дадзеным этапе ёсць шанцы атрымаць тое, што ён хоча. За рашэннямі Расіі заўсёды стаяць прагматычныя інтарэсы. Таму калі Расія пойдзе на істотнае зніжэнне кошту газу і нафты для Беларусі, то яна патрабуе нешта для сябе. Скажам, прыватызаваць пэўныя беларускія актывы.

**«Независимая газета» (Расія)**

Мэнэджар кіеўскай фармацэўтычнай кампаніі Вікторыя Яноўская пачала купляць беларускія прадукты недзе паўгода таму. Паспрабаваць смятану і масла з братэрскай рэспублікі яе ўгаварыла суседка, якая хваліла беларусаў за адданасць савецкім ГОСТам. Лабараторыі, якія робяць тэсты прадуктаў, пацвярджаюць рэпутацыю беларускіх вытворцаў. Але і некаторыя нашы вытворцы робяць не горш. Аднак у іх няма такога моцнага агульнага брэнда, як у пастаўшчыкоў з суседняй краіны. Цяпер галоўная зброя беларусаў — «евангелісты» ў шапіках: прадаўцы, якія самі вераць у тое, што гандлююць якаснай прадукцыяй. Яны гатовыя цэлы дзень казаць пра гэта спажыўцам, для якіх знак якасці СССР дагэтуль шмат што значыць.

**«Фокус» (Украіна)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ПОЛЬШЧА. ПАЎСТАЎ НОВЫ РЭГІЯНАЛЬНЫ РУХ

У польскім горадзе Сасновец створаны новы рэгіянальны рух — Таварыства заглембякаў. Арганізацыя патрабуе абароны лакальнай культуры, развіцця мясцовай свядомасці і стварэння асобнай адміністратыўнай адзінкі — Заглембя Домбровське. Заглембе — адзін з самых індустрыяльна развітых рэгіёнаў Польшчы — зараз уваходзіць у склад Сілезіі, аднак самі тубыльцы сябе сілезцамі не лічаць. Сілезія пасля падзелу Польшчы была часткай Германіі і на мясцовую гаворку і культуру паўплывалі трэнды з Берліну. Заглембе знаходзілася ў рускай каланіяльнай зоне, дзе асіміляцыя была не такой моцнай. Перспектывы мясцовага рэгіянальнага руху вельмі спрэчныя. Па-першае, у Сілезіі ўжо існуе Рух аўтаноміі Сілезіі, які мае фракцыю ў рэгіянальным парламенце і трымае манаполію на гэтую тэму. Па-другое, невядома, што рабіць з канцэпцыяй ідэнтычнасці заглембякаў. У савецкія часы ўлады раскруцілі міф пра чырвонае Заглембе (практычна да Другой сусветнай вайны камуністы мелі тут самыя моцныя ў Польшчы пазіцыі). Рэлікты таго міфу жывуць і дасюль і супрацьставіць ім пакуль няма чаго.

**Паводле польскай прэсы**

### ГЕРМАНІЯ. ЦІ ЎЖЫВАЎ КАКАІН ХОНЕКЕР?

Нямецкая партыя Левых, якая была створаная пры ўдзеле былых камуністаў Усходняй Германіі, запатрабавала легалізаваць у ФРГ усе віды наркотыкаў. На думку аўтараў ідэі, гэта адзіны сродак вывесці рынак наркотыкаў з-пад уплыву злачыннасці. Прапанова стала сюрпрызам нават для Зялёных — партыі, якія даўно займаецца гэтым пытаннем. Зялёныя не выходзілі за межы патрабаванняў свабодна прадаваць марыхуану. Сваю ініцыятыву сама партыя Левых тлумачаць неабходнасцю прыпыніць распаўсюд у Германіі «кракадзіла» — наркатычнай субстанцыі, якая прыйшла з Расіі. «Кракадзіл», ён жа дэзамарфін, з'явіўся ў Расіі некалькі гадоў таму. Гэта самы смяротны з сінтэтычных наркотыкаў. Працягласць жыцця тых, хто падсеў на «кракадзіл», — максімум два гады. Ідэя партыі Левых не засталася не заўважанай. Сатырыкі прапануюць левым выкарыстоўваць у якасці сімвалу серп і шпрыц, або ісці на выбары пад лозунгам: «Кокс — так, банкі — не!».

**Паводле нямецкай прэсы**

### УКРАІНА. СТРЭЛКАМІ ГАДЗІННІКА СУПРАЦЬ МАСКОВІІ

Украінскія нацыяналісты святкуюць перамогу — краіна ўсё ж перайшла на зімовы час. Самае цікавае, што ўкраінскі «часавы нацыяналізм» мае сваю традыцыю. Аказваецца, адным з рашэнняў ураду Украінскай Народнай Рэспублікі (УНР) быў пераход Украіны ў іншы, асобны ад Расіі часавы пояс. Здарылася гэта ў 1918 годзе, 12 лютага, калі ва Украіне быў уведзены сярэдненеўрапейскі час. Рабілася гэта на падставе таго, што «Украіна рашуча разрывае старыя прымусовыя сувязі з Масковіяй і пачынае цясней працаваць з Еўропаю. А таму прымае з ёй супольны час, вагу, каб спрасціць адносіны ў гандлю і падарожжы». Усім жыхарам Украіны рэкамендавалася перавесці гадзіннікі на 68 хвілін. Адна гадзіна і восем хвілін — менавіта столькі складала розніца ў часе паміж Расійскай Імперыяй і Еўропай. Праўда, невядома, наколькі самі чыноўнікі УНР былі ініцыятарамі той рэформы: на той час, адпаведна Брэсцкай дамове, уся Украіна была фактычна акупаваная войскамі Германіі і Аўстра-Венгрыі. Берліну і Вене было прасцей кіраваць Украінай, калі б яна мела з цэнтральнымі дзяржавамі аднолькавы час.

**Паводле ўкраінскай прэсы**

### ЗІМБАБВЕ. ДЫКТАТАР СМЯРОТНА ХВОРЫ?

У Зімбабве, якой 31 год кіруе дыктатар Роберт Мугабэ, пашыраюцца чуткі аб смяротнай хваробе дыктатара. Яны ўзніклі яшчэ ў верасні, пасля таго, WikiLeaks апублікаваў дэпешу амерыканскага МЗС. Адпаведна яе тэксту, у 2008 годзе супрацоўнік аднаго з пасольстваў ЗША ў Афрыцы меў кантакт з блізкімі да Мугабэ людзьмі, якія прызналіся, што ў Роберта рак прастаты. Па словах інфарматараў, жыць Мугабэ засталося максімум тры гады. Цяпер плётка набывае афіцыйны кампанент. Прэм'ер-міністр Зімбабве Морган Тсвангараі публічна заявіў, што Мугабэ трэба сысці з прычыны яго «ўзросту і стану здароўя». Пры гэтым урадовец адмовіўся прызнаць, што гаворка ідзе пра рак. Ён жартам сказаў, што дакладна гэта не малярыя, якую можна лячыць у суседнім шпіталю. Што тычыцца самога Мугабэ, то ён 29 кастрычніка вярнуўся на радзіму з Сінгапуру і заявіў, што адчувае сябе здаровым.

**Паводле французскай прэсы**



---

▶ **ВЫБАРЫ**

# ДНЯСТРОЎСКІ ХАОС

**На мінулым тыдні набыў дынаміку палітычны працэс у Малдове і Прыднястроўі. У Кішынёве кампартыя страціла магчымасць блакаваць абранне прэзідэнта, а ў Цірaспалі прыднястроўскі прэзідэнт Ігар Смірноў прапанаваў плебісцыт наконт далучэння да Украіны. Пра прычыны і магчымыя наступствы апошніх падзей журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з малдаўскім журналістам Алегам Сіняевым.**



Ігар Смірноў

***— 4 лістапада выбухнула сапраўдная палітычная бомба. Тройка дэпутатаў Кампартыі Рэспублікі Малдова (ПКРМ) паклала партбілеты на стол. Што стаіць за дэмаршам групы раскольнікаў, якую ўзначальвае малады функцыянер Ігар Дадон?***

— На працягу апошняга года нарасталі істотныя супярэчнасці ў кіраўніцтве ПКРМ. Адмысловую вастрыню яны набылі па восі супрацьстаяння двух асобаў Ткачук — Дадон. Марк Ткачук у сваёй барацьбе за манаполію ў прыняцці стратэгічных партыйных рашэнняў і ўплыве на старшыню Вароніна, так ці інакш, павінен быў істотна пацісніць Дадона. Асабістая вайна дасягнула свайго зеніту пасля нядаўняй публікацый артыкула Дадона наконт неабходнасці мадэрнізацыі партыі. Ткачук высмеяў дадонаўскія тэзісы, назваў іх «канспектам выступаў Вароніна», што і стала сігналам для дысідэнтаў.

***— Газета «Коммерсант» сцвярджае, што Дадон падаўся на вольныя хлябы пасля кансультацый з шэрагам палітыкаў у Маскве.***

— Крэмль у сваіх пошуках саюзнікаў у Малдове, зразумела, разлічвае на Дадона, а ва ўмовах далейшага знаходжання Дадона ў ПКРМ на другіх ролях дадзеная падтрымка пазбаўляецца ўсякага сэнсу. Дадон, па меркаванні расійскіх тэхнолагаў, ужо даўно саспеў для ўласнага палітычнага праекта. У гэтых умовах магчымая розная камбінаторыка ў левым сегменце малдаўскай палітыкі. Магчыма, Партыя патрыётаў Малдовы Міхася Гарбуза ўжо ў самай найбліжэйшай будучыні пойдзе на ўзаемадзеянне з такімі палітыкамі, як Дадон, фармуючы новую левую кааліцыю па-за рамкамі ПКРМ.

***— Як самі камуністы рэагуюць на адзюльтэр Дадона?***

— Для лідара ПКРМ Уладзіміра Вароніна вестка пра выхад з партыі «групы Дадона», падобна, стала непрыемнай. Па яго меркаванні, гаворка ідзе пра «брудныя гульні за пасады». Гэта моцны ўдар для Вароніна, паколькі трыма дэпутатамі страты ПКРМ могуць не абмежавацца. Пра тое, што неўзабаве за «групай Дадона» могуць рушыць і іншыя сябры камуністычнай фракцыі, гавораць самі камуністы.

***— Раскол Кампартыі цікавы з улікам раскладу мандатаў у малдаўскім парламенце. У выніку сыходу Дадона ПКРМ пазбаўляецца блакавальнага пакета, які не дапускае абрання на пасаду кіраўніка дзяржавы кандыдата ад урадавага правага альянсу «За еўраінтэграцыю» (AEI). Цяпер, быццам, ёсць шанс паставіць кропку ў гісторыі інстытуцыянага крызісу, які цягнецца амаль паўтара года?***

— Па словах Ігара Дадона, прынятае ім рашэнне будзе служыць рэалізацыі «важнай задачы» — пераадоленню палітычнага крызісу і абрання прэзідэнта. Аднак ён кажа, што гэтыя прэзідэнт не павінны быць сябрам хоць нейкай партыі. Для групы Дадона галасаваць за кандыдатаў альянсу — значыць зрабіць палітычны суіцыд. Левы баршчык назаўжды згубіць інтарэс да яго праектаў.

***— Як рэагуюць партыі альянсу на крок Дадона і перспектыву падтрымкі яго групоўкай кандыдата ад правых?***

— Лідараў правай кааліцыі інфармацыя пра рашэнне Ігара Дадона, падобна, таксама заспела знянацку, і, адпаведна, нічога выразнага адносна магчымасці супрацоўніцтва з новай палітычнай сілай яны пакуль сказаць не змаглі. Дый і сам альянс зараз не стабільны.

***— Не менш цікавыя працэсы адбываюцца па той бок Днястра. Ігар Смірноў, які кіруе МПР ужо 10 гадоў, заявіў пра магчымы рэферэндум пра далучэнне рэгіёна да Украіны.***

— Па словах Смірнова, ім кіруе высакародны парыў аднавіць гістарычную справядлівасць. Прыднястроўе было аўтаноміяй у складзе савецкай Украіны, а раней, пасля ліквідацыі Запарожскай сечы, тут была калонія беглых украінскіх сялян. Аднак відавочна, што за праўкраінскай рыторыкай хаваецца палітычны манеўр. Смірноў займаецца шантажам Масквы, з якой ён пасварыўся пасля таго, як высунуў сваю кандыдатуру на снежаньскія прэзідэнцкія выбары. Па сутнасці прамова Смірнова пра гістарычнае права Украіны на Прыднястроўе — адказ на тое, што ў Маскве завялі крымінальную справу на яго сына Алега. Ён быццам займаўся банкаўскімі махінацыямі з расійскай гуманітарнай дапамогай, якую дасылалі для прыднястроўскіх пенсіянераў. Хутчэй за ўсё, гэта праўда. Аднак тое, што смірноўскі клан доўгі час пракручвае расійскія грошы, ведалі ўсе. Гуманітарка ішла ў рэспубліку з 2006 года, аднак толькі зараз у Маскве чамусьці задумаліся, што трансферы адбываліся праз рахункі Газпрамбанка, які належыць родным прэзідэнта.

***— У чым прычына нервовых паводзінаў Масквы?***

— Аказалася, што нават на перыферыі, якая цалкам залежыць ад датацый з Масквы, існуе глеба для антымаскоўскіх настрояў. Прабудзіць іх аказалася няцяжка. Як толькі Анішчанка заявіў, што ў яго ўзніклі пытанні наконт якасці прыднястроўскіх каньякоў (гонар прыднястроўскай прамысловасці) джын патрыятызму вырваўся на волю. Тыя, хто падтрымліваў стаўленіка Крамля Анатоля Камінскага, пачалі агітаваць за Смірнова. Апытанні паказваюць, што рэйтынг Смірнова на парадак большы за Камінскага. У апошняга 20 працэнтаў, а ў Смірнова — каля 30. Прамахнуліся ў Маскве і з фігурай, якая мусіла сімвалізаваць перамены. Анатоль Камінскі — пажылы чалавек, якому 62 гады і які амаль увесь час працаваў чыноўнікам. Ён, у адрозненні ад Смірнова, не мае харызмы.

***— У снежні адбудуцца выбары прэзідэнта ПМР. Якія сцэнары развіцця падзей разглядаюцца?***

— Смірноў не сыдзе. Масква павінна мець вельмі сур'ёзныя аргументы ў ціску на Смірнова, каб прымусіць яго сысці самастойна. Ні ў аднаго з яго апанентаў па прэзідэнцкіх выбарах пакуль няма ніводнага шанцу перайграць Смірнова. Нават у Камінскага, які займеў як падтрымку карпарацыі «Шэрыф», так і блаславенне Крамля. Таму можна прагназаваць толькі другі тур выбараў. Ведаючы прозвішча тых, хто пройдзе ў фінальны пул, можна будзе будаваць далейшыя прагнозы. Акрамя Камінскага і Смірнова дастаткова высокі рэйтынг мае трэці кандыдат — Яўген Шаўчук, які лічыцца самым папулярным палітыкам Прыднястроўя.

***— А як паставіліся ў Кіеве да незвычайнай ініцыятывы Смірнова?***

— За час знаходжання Смірнова на пасадзе прэзідэнта ПМР украінскія палітыкі вывучылі яго супярэчлівую натуру і асабліва не даваяраюць. Акрамя таго Януковіч, думаю, памятае, як у часы яго прэм'ерства Смірноў заблакаваў чыгуначныя зносіны паміж Кішынёвам і Кіевам. Дый сам Смірноў не даверае ўкраінцам. Калісьці яны дазволілі малдаўскай разведцы арыштаваць яго наўпрост у Кіеве. Адным словам, Януковіч не захоча лезці ў гэты канфлікт. Яму Прыднястроўе з яго праблемамі сапраўды не трэба. І сам Смірноў гэта добра разумее. Аднак чаму на радасць прыднястроўскім патрыётам не пазлаваць Маскву?

ЦІКАВА

# ДУРНЫЯ, ЗЛЫЯ І СТАТУСНЫЯ

Алег НОВІКАЎ

**Французскае грамадства паўстала ў абарону сатырычнага выдання «Charlie Hebdo», офіс якога падпалілі ісламісты. Так нечакана вельмі хуліганскае выданне стала сімвалам мясцовай журналістыкі.**




Як вядома, падпал офісу рэдакцыі адбыўся ў мінулую сераду. Падпал, а таксама хакерская атака на сайт, безумоўна, звязаныя з тэмай апошняга нумару. Выпуск прысвечаны перамозе памяркоўных ісламістаў на выбарах у Тунісе, а таксама праекту ўвядзення ісламскага права Шарыят у посткадафіскай Лівіі. Тое, што адбылося, можна таксама лагічна звязаць з палемікай вакол публікацый у газеце карыкатур на Мухамеда ў 2006 годзе. Тады мусульманскія арганізацыі спрабавалі асудзіць «Charlie Hebdo», аднак суд аказаўся на баку журналістаў.

Хаця ў выніку таго працэсу газета абараніла права на публікацыі падобных карыкатур, стаўленне грамадства да выхадкі «Charlie Hebdo» было дастаткова насцярожанае. Так, прэзідэнт Жак Шырак крытычна паставіўся да перадрукоўкі малюнкаў з дацкай газеты. Зараз сітуацыя іншая. Вядучыя газеты краіны прапанавалі сваю дапамогу ў публікацыі новага нумару «Charlie Hebdo». У Парыжы адбыўся марш салідарнасці з журналістамі, у якім у тым ліку прынялі ўдзел ісламскія арганізацыі. Яны неслі транспарант «Мусульмане таксама могуць смяяцца». Можна сказаць, што напад на рэдакцыю разглядаецца большасцю як замах экстрэмістаў на свабоду прэсы. Адначасова рэзка павысіўся статус выдання, яно стала адным з інстытутаў нацыянальнай прэсы.

На першы погляд, гэта поўны нонсенс. «Charlie Hebdo» — палітычна-сатырычнае выданне, якое працуе ў стылі брутальнага чорнага гумару. Да прыкладу, можна згадаць вокладку аднаго з выпускаў 2005 года, калі ў краіне праходзіў рэферэндум наконт праекту Еўрапейскай канстытуцыі. Тады шматлікія арганізацыі заклікалі да байкоту рэферэндуму. Адгукнулася і «Charlie Hebdo». Газета размясціла выяву самалёта, які падаў у акіян (трагедыя сапраўды мела месца), і дадала надпіс: «235 чалавек (менавіта столькі было на борце разбітага авіялайнера) падтрымалі ідэю байкоту».

Знаўцы гісторыі французскай журналістыкі, аднак, не лічаць «Charlie Hebdo» чымсьці ўнікальным. Стыль газеты звязаны з традыцыямі французскай сатыры XIX стагоддзя, якая змагалася за аддзяленне Касцёла ад дзяржавы. У выніку аб'ектамі жартаў часта станавіліся маральныя нормы хрысціянства. У 1950-я гады пасля вяртання Шарля дэ Голя ва ўладу, у Францыі зноў усталявалася нейкая буржуазная ідылія, падобная на старыя часы. І культура радыкальнага гумару зноў адрадзілася. У 1960-х некалькі маладых сатырыкаў вырашылі стварыць свой праект. Газету назвалі «Hara-Kiri».

Каб сабраць грошы на друк і працу рэдакцыі, аўтарам спатрэбіцца даводзілася самім прадаваць наклад на вуліцах. Толькі праз год часопіс з'явіўся ў шапіках. Рэакцыя аўдыторыі была спецыфічная. У адным з першых лістоў ад чытачоў, які прыйшоў на адрас рэдакцыі, было напісана: «Вы дурныя, і ў дадатак вы не проста дурныя, вы яшчэ і злыя». Журналісты палічылі гэта добрай характарыстыкай канцэпцыі выдання. Так з'явіўся славуты слоган: «Hara-Kiri» — выданне для дурных і злых».

Змест матэрыялаў «Hara-Kiri» адразу выклікаў цікавасць цэнзараў. Ужо праз год у выдаўцоў адабралі ліцэнзію. Нейкім чынам ім удалося захаваць праект. Гісторыя паўтарылася яшчэ праз пару гадоў. А вось у 1970-м выратаваць газету не ўдалося. Міністр унутраных спраў асабіста патрабаваў яе закрыцця.

Каб зразумець, чаму гэта здарылася, трэба ўзгадаць, што адбылося ў сталічным танцавальным клубе «Пяць-сем». Тады з-за пажару загінула каля 100 маладых людзей. Усе тагачасныя жоўтыя газеты стракацелі загалоўкамі кшталту: «Баль у «Пяць-сем» — 100 нябожчыкаў». Прыкладна ў гэты час у сваёй рэзідэнцыі Каламбэ памёр Шарль дэ Голь. «Hara-Kiri» адразу адгукнулася загалоўкам: «Баль у Каламбэ — адзін нябожчык». Такога здзеку ўлады газетчыкам не прабачылі.

Праз тыдзень пасля забароны «Hara-Kiri» на свет нарадзіўся новы праект — «Charlie Hebdo», што можна перакласці як «Тыднёвы Шарль» — яўны жарт з нябожчыка. Аднак заснавальнікам удалося пераканаць дзяржаўныя органы, што гаворка не пра Шарля, а пра Чарлі — дакладней, пра Чарлі Чапліна. Дазвол на выданне «Charlie Hebdo» быў атрыманы.

1970-я гады можна лічыць залатым часам для «Charlie Hebdo». Тагачасная сэксуальная рэвалюцыя пахавала шматлікія табу. Смяяцца з тэмаў сэксу, сям'і або царквы стала прасцей. Масавая палітызацыя юнацтва пасля 1968-га прывяла ў журналістыку шмат цікавых аўтараў, якія зараз лічацца класікамі французскай сатыры.

Напрыклад, карыкатурыст Жорж Валінскі або актор Мішэль Калюш. Менавіта з прозвішчам апошняга звязаная самая буйная правакацыя газеты тых часоў. На базе «Charlie Hebdo» быў створаны выбарчы штаб Калюша, якія абвясцілі пра намер заняць пасаду прэзідэнта на выбарах 1981 года. Вар'яцкая кампанія, адным з лозунгаў якой было надаць права чарнаскурым шафёрам давіць белых пешаходаў, нечакана спадабалася французам. Адпаведна сацыялагічным апытанням, Калюш быў трэцім па папулярнасці кандыдатам пасля Жыскар д'Эстэна і Франсуа Мітэрана. На жаль пасля таго, як пры таямнічых абставінах быў забіты імпрэсарыо Калюша, той вырашыў выйсці з выбарчай гонкі.

Разам з пазітывам 1970-я прынеслі і негатыў: нафтавы шок і, як следства, эканамічную рэцэсію ў Заходняй Еўропе. У 1982 годзе газета апынулася ў крызісе. Праект давялося зачыніць. Толькі ў 1992-м ён адрадзіўся пад кіраўніцтвам Філіпа Валя. На першай старонцы аднаўленай газеты было напісана, што выйдзе тры нумары, а пасля газету абавязкова забароняць. На гэты час у Францыі існаваў сапраўдны міф пра «Charlie Hebdo». Наклад першага нумару склаў 120 тысяч экземпляраў. Зараз сярэдні тыраж газеты 60 тысяч асобнікаў.

Канцэпцыя «Charlie Hebdo» апошніх часоў трошкі змянілася. Цяпер тут менш бытавога гумару, кшталту парадаў падлеткам, як пазбавіцца ад надакучлівых бацькоў. У 1970-я выданне рэкамендавала спакусіць іх сэксуальна, каб яны атрымалі турэмны тэрмін як вычварэнцы і не перашкаджалі гучна слухаць музыку. Зараз у газеце больш палітыкі.

Сама рэдакцыя яскрава праяўляе свае сімпатыі да левых. Той жа Філіп Валь заклікаў галасаваць за Зялёных і падтрымаў ідэю прыняцця Еўрапейскай канстытуцыі. Аднак гэта не значыць, што ў рэдакцыі існуюць дыктат і цэнзура. Вядучыя журналісты могуць пісаць усё, што ім захочацца.

Апошні падзеі адчыняюць новую старонку ў гісторыі незвычайнай газеты. Калі меркаваць па першай рэакцыі, «Charlie Hebdo» гатова правакаваць і далей. На першай старонцы нумару, які з'явіўся пасля падпалу рэдакцыі, выяўлены тыповы мусульманскі мужчына, які застыў у пацалунку з журналістам «Charlie Hebdo».

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ЗБІГНЕЎ ЗЁБРА



Дэпутата Еўрапарламенту, аднаго з самых аўтарытэтных польскіх палітыкаў, былога міністра юстыцыі выключылі з яго роднай партыі «Права і Справядлівасць» (PiS). На думку каментатараў, за рашэннем стаіць непасрэдна Яраслаў Качыньскі, старшыня PiS. Матывам маглі, хутчэй за ўсё, быць унутрыпартыйныя дэбаты аб прычынах катастрофы на парламенцкіх выбарах 8 кастрычніка. Партыя Качыньскага прайграла лібералам з «Грамадзянскай платформы». Прычым гэта была ўжо шостая запар параза кансерватараў за апошнія тры гады. Такая тэндэнцыя, натуральна, выклікала думку пра неабходнасць змены кіраўніка. Галоўным кандыдатам, які зойме пасаду Качыньскага, называўся менавіта Зёбра, за што ён, хутчэй за ўсё, і паплаціўся. Цяпер гадаюць, што будзе рабіць пан Збігнеў. Магчыма, ён паспрабуе заснаваць новую партыю. Аднак пра яе перспектывы казаць вельмі цяжка. Хаця зараз 9 працэнтаў палякаў не супраць за яе галасаваць. Нагадаем, што ўвесну ад PiS адкалолася незадаволеная Качыньскім група палітыкаў, якія стварылі партыю «Польшча — самае важнае». Партыя, аднак, не здолела зламаць манаполію PiS на правым флангу, набраўшы 2,9 працэнта.

### МУХТАР АБЛЯЗАЎ



Казахскі апазіцыйны палітык заклікаў удзельнікаў страйку казахскіх нафтавікоў да стварэння паралельных органаў улады. Ён тлумачыць сваю прапанову так: «Гэта значыць абраць са свайго асяроддзя сваіх «сапраўды народных дэпутатаў». Нагадаем, што з мая гэтага года трывае забастоўка нафтавікоў у Мангышлаку. Дзякуючы падтрымцы дэмакратычных сіл, незалежнай прэсы і сусветных рок-зорак кшталту Стынга, тое, што адбываецца ў Мангышлаку, апынулася ў цэнтры ўвагі замежнай грамадскасці, і Назарбаеў пазбаўлены магчымасці выкарыстаць сілу для падаўлення сацыяльнага пратэсту. Таму ўлады вырашылі задушыць рабочых эканамічна, звальняючы іх і пазбаўляючы сталага заробку. Аднак тут узнікла праблема: асноўная частка выстаўлены за вароты людзей — мясцовыя жыхары, якім няма куды падзецца. На думку Аблязава, іншай альтэрнатывы, як стварыць новыя органы ўлады, у іх няма. Аблязаў лічыць, што спачатку можна заснаваць нешта накшталт савету працоўных дэпутатаў, як у часы першай рускай рэвалюцыі. Пры гэтым ён лічыць, што ўлада не будзе здольная разагнаць такі савет, калі большасць яго сяброў будуць паважаныя ў грамадстве асобы. Дзіўная рэч, аднак Аблязаў дасюль не затрыманы за падобныя экстрэмісцкія заклікі. Магчыма, улады сапраўды баяцца пашырэння ідэі стварэння паралельных органаў улады.

### МАРЫЯНА РАХОЙ

Кандыдат ад іспанскіх кансерватараў перамог галоўнага праціўніка — сацыяліста Альфрэда Рубалькаба ў выніку тэлевізійных дэбатаў, якія прайшлі 7 лістапада. Марыяна, чыя партыя знаходзіцца ў апазіцыі ўжо восем гадоў, спадабаўся 46 працэнтам аўдыторыі (у Альфрэда, адпаведна, 41 працэнт). Апытанні правяла папулярная газета «El Pais». На думку аглядальнікаў, вынік дэбатаў канчаткова сведчыць пра тое, што ў Мадрыдзе зменіцца ўлада. У рэзідэнцыю хутка пераедуць правыя. Пры гэтым усе адзначаюць, што Рубалькаба выглядаў на экране лепш за апанента. Аднак, здаецца, простым людзям абыякавы яго ўзровень аргументацыі і майстэрства палемікі. Проста ў выніку крызісу сацыялісты ўсіх дасталі. У такой сітуацыі адзіная надзея левых на тых 13 працэнтаў іспанцаў, якія дасюль не вызначаліся, за каго будуць галасаваць. Надзея слабая, аднак павялічыць колькасць фракцыі сацыялісты здольныя. Гэта можна быць фатальным для правых, паколькі ім патрэбная парламенцкая большасць для фармавання аднапартыйнага ўраду. Зараз, адпаведна апытанням, яны балансуюць на мяжы патрэбнай колькасці мандатаў.



НАТАТКІ

# ЗАБОЙСТВА ВІЛЬГЕЛЬМА

## МІФЫ, ЛЕГЕНДЫ, РЭАЛЬНАСЦЬ (ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЕ ЭСЭ)

Гісторыка-дакументальнае эсэ — так сціпла азначыў жанр свайго твору аўтар. Але дакладней, на мой погляд, — гістарычны дакументальны дэтэктыў. Прычым першы ў Беларусі. І першае ж усебаковае і глыбокае гісторыка-дакументальнае расследаванне аднаго з найбольш скандальных і дагэтуль заблытаных забойстваў, што абраслі міфамі і легендамі. Хто замовіў Кубэ? Каму была выгодна яго смерць? Чый план — НКУС ці гестапа — быў рэалізаваны? Як склаўся лёс жонкі і дзяцей Кубэ пасля вайны? На гэтыя і іншыя пытанні аўтар адказвае на аснове скрупулёзнага вывучэння дакументальных крыніц з архіваў пяці краін — Беларусі, Расіі, Украіны, Германіі і Польшчы, а таксама сведчанняў і ўспамінаў удзельнікаў тых падзей.

**Аляксей Кароль**

**Анатоль ВАЛАХАНОВІЧ**

**У ноч на 22 верасня 1943 года ў 00 гадзін 40 хвілін (паводле іншых звестак, у 2 гадзіны 15 хвілін) у Мінску ў спальні генеральнага камісара Беларусі, гаўляйтара Вільгельма Кубэ, які жыў у трохпавярховым асабняку па вуліцы Тэатрштрасэ, 27 (да вайны і цяпер вуліца Энгельса), узарвалася магнітная міна. Выбухам Кубэ разарвала левы бок грудзі і адарвала левую руку. Напаўабгарэлы труп гаўляйтара вынеслі з ахопленай агнём спальні служачыя газавай каманды, якіх паднялі па трывозе, і дзяжурныя.**

**Побач з Кубэ спала жонка Аніта, якая была на дзявятым месяцы цяжарнасці, яна атрымала толькі нервовы шок. Міна была мэтанакіраванага дзеяння і ўзарвалася строга ўверх. Іх трое малалетніх дзяцей, якія спалі ў суседніх пакоях, таксама засталіся непашкоджанымі.**

### Прадмова

Спецаперацыі партызанскіх фармаванняў, у тым ліку і фізічнае знішчэнне вышэйшых нацысцкіх чыноўнікаў і здраднікаў Радзімы, лічыліся адным з важнейшых накірункаў актыўнай барацьбы ўсіх карных органаў савецкай улады і мэтай партызанскіх баявых аперацый, разгорнутых на акупаванай тэрыторыі СССР у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Партызаны вялі дакладны ўлік ахвяраў захопнікаў. На аснове прысудаў, вынесеных партызанамі нямецка-фашысцкім карнікам, толькі пры непасрэдным удзеле Асобнай мотастралковай брыгады асобага прызначэння Народнага камісарыята ўнутраных спраў СССР было здзейснена 87 актаў народнай помсты.

Заданне па ліквідацыі генеральнага камісара Беларусі гаўляйтара Вільгельма Кубэ атрымалі ўсе беларускія партызанскія атрады і брыгады. На Кубэ палявалі Народны камісарыят унутраных спраў СССР (НКУС СССР) і Народны камісарыят унутраных спраў БССР (НКУС БССР), Галоўнае разведвальнае ўпраўленне Генеральнага штаба (ГРУ ГШ) Чырвонай арміі, Цэнтральны штаб партызанскага руху (ЦШПР) і Беларускі штаб партызанскага руху (БШПР).

На працягу лета і пачатку восені 1943 года актыўна і безвынікова выследжваўся няўлоўны гаўляйтар. У гэтым паляванні прымалі ўдзел партызаны шэрагу атрадаў і брыгад наваколля Мінска, у тым ліку і спецатрады НКУС СССР і НКУС БССР — С. Ваўпшасава, П. Лапаціна, І. Залатара, спецатрад ГРУ ГШ Чырвонай арміі «Дима» Д. Кеймаха і многія іншыя. Але марна: Кубэ меў у Мінску і бліжэйшым наваколлі да 8 месцаў, дзе мог пераначоўваць ці адпачываць.

Замахі на жыццё Кубэ здзяйсняліся шматразова. 22 ліпеня 1943 года адбыўся моцны выбух у мінскім гарадскім тэатры. Паводле дадзеных ЦШПР і ГРУ ГШ Чырвонай арміі, было забіта шмат жыхароў Мінска. Але Вільгельм Кубэ ў тэатр не прыйшоў, хоць і меўся быць на ўрачыстым пасяджэнні Саюза беларускай моладзі, які толькі што ўтварыўся. Жыхары Мінска ўспаміналі, што каля кантралёра ля дзвярэй тэатра стаяў немец і не пускаў немцаў у тэатр. Відаць, фашысты даведаліся, што ў тэатры заклалі міну, і ўпускалі толькі жыхароў Мінска.

Летам 1943 года разведчыца партызанскай брыгады «Градава» (С. Ваўпшасава) В. Курыловіч устанавіла, што Кубэ часта ездзіць у адну са сваіх загарадных рэзідэнцый (ці дом адпачынку) у саўгас «Лошыца» (цяпер паўднёвы мікраёў Мінска). Група партызан-разведчыкаў прасачылася на паўднёвую ўскраіну Мінска, некалькі дзён сядзела ў засадзе на шашы Мінск–Лошыца, у раёне якой была рэзідэнцыя. Але машына гаўляйтара ў гэтыя дні так і не з'явілася.

У канцы жніўня 1943 года «Градаў» зноў накіраваў у Мінск групу «паляўнічых»: стала вядома, што на 6 верасня прызначаны вялікі банкет з выпадку 10-годдзя прыходу Гітлера да ўлады. Тады быў здзейснены выбух у афіцэрскай сталовай. Загінула 36 высокапастаўленых нямецкіх афіцэраў і чыноўнікаў. Але Кубэ і на гэтым банкеце не было.

У 1942–1944 гадах на тэрыторыі Беларусі былі знішчаны: галоўны камісар Баранавіцкай акругі Ф. Фэнц, абласны камісар Л. Эрэнляйтнер, кіраўнік аддзела працы і сацыяльнай палітыкі Генеральнага камісарыята Беларусі Г. Фройдэнберг, урадавы інспектар Г. Клозе, бургамістр горада Ваўкавыска Берг, мінскі абласны гаспадарчы кіраўнік Г. Беневіч, начальнік Мінскай абласной жандармерыі К. Кале, камандзір паліцыі бяспекі ў горадзе Вілейка Р. Граве і іншыя. У верасні 1943 года, за тры месяцы да сваёй гібелі, Кубэ адзначаў, што толькі на «Магілках герояў у горадзе Мінску знайшлі вечны спакой звыш 1600 чалавек — салдаты вермахта, супрацоўнікі цывільнай адміністрацыі і імперскай чыгункі».

Непасрэднымі выканаўцамі забойства Вільгельма Кубэ ў гісторыі Вялікай Айчыннай вайны прынята лічыць трох Герояў Савецкага Саюза — Алену Рыгораўну Мазанік, Марыю Барысаўну Осіпаву і Надзею Віктараўну Траян. Гэта яны забілі Кубэ.



**Валахановіч Анатоль Іосіфавіч**

Гісторык, пісьменнік, журналіст. Нарадзіўся 17 красавіка 1939 года ў Мінску. У 1961 годзе закончыў гісторыка-філалагічны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А.М. Горкага (цяпер Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка). З 2006 года сябар Саюза беларускіх пісьменнікаў, з 1975 года — сябар Саюза журналістаў Беларусі. Ганаровы сябар Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі (2009). У 1961–1968 гадах працаваў настаўнікам, дырэктарам сярэдніх школаў Мінскай вобласці. У 1962–1964 гадах служыў у Групе савецкіх войск Германіі (ГСВГ).

Пісаць і друкавацца пачаў яшчэ ў студэнцкія гады, з 1959 года. Даследуе праблемы гісторыі, літаратуры, культуралогіі, краязнаўства, этнаграфіі Беларусі, палітычных рэпрэсій 20–50-х гадоў XX стагоддзя.

Аўтар шэрагу кніг, звыш 450 навуковых і навукова-папулярных артыкулаў, нарысаў, апавяданняў і эсэ ў энцыклапедычных выданнях, навуковых зборніках, матэрыялах навуковых канферэнцый, часопісах, газетах, кнігах.

### Курт фон Готберг

Генерал Курт фон Готберг, камандзір СС, не любіў Кубэ. Готберг затаіў злосць на гаўляйтара, бо той пастаянна крытыкаваў за надзвычай жорсткія расправы «ведамства» Готберга над мірным беларускім насельніцтвам. Готберг і Кубэ, як мядзведзі, не маглі жыць у адной бярлозе. Аднаму з іх трэба было сыходзіць, ці адзін знішчыць другога. Перамогу мусіў атрымаць ці дужэйшы, ці хітрэйшы.

Курт фон Готберг нарадзіўся 12 лютага 1896 года ў Дойч Вільтэн, Германія. У 1914–1919 гадах удзельнічаў у Першай сусветнай вайне. У 1932 годзе ўступіў у НС ДАП і СС. У 1937–1939 гадах працаваў у галоўным ведамстве па расавай палітыцы і перасяленнях. З кастрычніка 1940 года па ліпень 1942 года — у Галоўным упраўленні СС. У кастрычніку 1942 года прызначаны начальнікам СС і паліцыі Беларусі. З 23 верасня 1943 года, пасля смерці Кубэ, выконваў абавязкі генеральнага камісара Беларусі. Пазней ён быў накіраваны ў Францыю, дзе яго арыштавалі саюзнікі. У палоне Готберг закончыў жыццё самагубствам.

Готберг напісаў ананімны ліст жонцы Кубэ Аніце, што той у Мінску паводзіць сябе «неадпаведным чынам». Аніта з трыма дзецьмі тэрмінова прыехала да мужа. Кубэ пачаў бавіць час з дзецьмі і жонкай, кожную ноч ён заставаўся дома. А да прыезду Аніты ў Мінск нават абслуга і яго шафёр не ведалі, куды паедзе пасля працы Кубэ. І толькі ў машыне ён казаў шафёру, куды трэба яго везці. Вось чаму партызаны не маглі ўпаляваць Кубэ. Куды і калі паедзе гаўляйтар — толькі сам Кубэ гэта ведаў і ўласнаручна камандаваў сваім лёсам, таму і быў такі няўлоўны.

Свядома ці міжволі, але Готберг сваімі лістамі-«філіпікамі» ў Берлін пра «нявартыя паводзіны ў побытце» Кубэ прыгвазадзіў яго да дома, да жонкі, да дзяцей. Ісці на працу — рукой падаць, праз брамку ў плоце, якая круглыя суткі ахоўвалася знешняй ахоўвай вакол асабняка Янчэўскага, дзве хвіліны — і ў будынку былога ЦК КП(б)Б, на працоўным месцы ў сваім кабінеце.

Мо гэта і ўваходзіла ў далёкасяжныя планы Готберга, каб нейк замацаваць Кубэ ў ягоным асабняку. Бо паспрабуй здагадацца, дзе гаўляйтар будзе начаваць на гэты раз. А тут ён будзе спаць у сваёй спальні — усе гэта добра ведаюць. А калі Кубэ паедзе куды-небудзь у камандзіроўку па сваёй вялікай вотчыне — па Беларусі, першымі пра гэта будуць ведаць яго сямейнікі і Мазанік, якая звычайна збірала яго ў дарогу. Вось так! Знайдзіце дарожку ў асабняк Кубэ, знайдзіце дарожку да сэрца абслугі ў асабняку — і справа зроблена.

Існуе версія пра забойства Кубэ і з нямецкага боку, і з боку народных мсціўцаў: вы, народныя мсціўцы, шукайце доступ у асабняк Кубэ, мы, немцы, на гэта глядзім скрозь пальцы, не будзем ні замінаць, ні дапамагаць.

### Вільгельм Кубэ. Хто ён?

17 ліпеня 1941 года Гітлер сваім указам прызначыў Кубэ генеральным камісарам Генеральнай акругі Беларусі. Той накіраваўся ў Беларусь для «гіганцкай падзвіжніцкай работы, каб пачаць будаваць жыццё па прыкладу Еўропы».

Кубэ быў вопытны і хітры палітык. Для ажыццяўлення германскіх імперскіх планаў ён выкарыстоўваў вядомы метад «бізуна і перніка» асцярожна і гібка. Кубэ вылучыў ідэю скарыстання беларусаў у акупацыйных структурах, дазволіў стварэнне шэрагу беларускіх нацыянальных супольнасцей і тлумачыў сваю ініцыятыву недвухсэнсоўна: «Гэта выгадна, каб авалодаць душой гэтага народа». У выніку чаго «беларускае нацыянальнае адраджэнне» апынулася пад моцнымі крыламі германскага імперскага арла. Вядомы савецкі разведчык Герой Савецкага Саюза Р.М. Мінакоў назваў Кубэ «вопытным і небяспечным праціўнікам, які быў вядомы сваімі «правакацыйнымі выступленнямі».

Палітычны дзеяч, паэт і драматург Вільгельм Кубэ нарадзіўся 13 лістапада 1887 года ў горадзе Глогаў (Сілезія) на Одэры ў сям'і евангелістаў. Бацька, Рыхард, — прафесійны ваенны, унтэр-афіцэр — неўзабаве пераехаў у Берлін, дзе працаваў зборшчыкам падаткаў. У Берліне Вільгельм вучыўся ў пачатковай школе і гуманітарнай гімназіі. У 1908–1912 гадах вывучаў гісторыю і дзяржаўнае права ў Берлінскім універсітэце. Кубэ — адзін са стваральнікаў Нямецкага нацыянальнага студэнцкага саюза «Гітлерюгенд», узначальваў арганізацыю ў 1911–1914 гадах і рэдагаваў яе газету. У 1911 годзе ўступіў у Нямецкую сацыялістычную партыю, у 1912 годзе — рэдактар газеты ў горадзе Вісмары. Неўзабаве Кубэ выйшаў з гэтай партыі і стаў сябрам Нямецкай кансерватыўнай партыі. Да 1919 года быў яе акруговым сакратаром у горадзе Брэслаў, супрацоўнічаў з рэдакцыяй газеты, а потым стаў яе рэдактарам. У 1917 годзе праявў тры тыдні ў казармах у якасці ландштурмана, але быў адкліканы адтуль сваёй партыяй.

Пасля паразы Германіі ў Першай сусветнай вайне Кубэ парваў з Нямецкай кансерватыўнай партыяй. У 1919 годзе ён удзельнічаў у стварэнні Нямецкай нацыянальнай народнай партыі і хутка стаў генеральным сакратаром яе акруговай арганізацыі ў Сілезіі, з 1920

# КУБЭ

года — у Берліне, дзе, акрамя таго, у 1922–1923 гадах выконваў абавязкі гарадскога дэпутата. Аднак і гэта партыя здаецца Кубэ недастаткова баявой. У 1923 годзе ён пакінуў партыю і разам з сябрамі стварыў Нацыянал-сацыялістычную партыю свабоды, у 1925 годзе атрымаў ад яе мандат дэпутата Рэйхстага і пачаў выступаць абаронцам Нацыянал-сацыялістычнай рабочай партыі Германіі (НСРПГ).

1 снежня 1927 года Кубэ ўступіў у гэтую партыю, якая на той час стала легальнай, і ўжо праз некалькі тыдняў за заслугі перад нацыянал-сацыялістычным рухам Гітлер прызначыў яго гаўляйтарам (абласны кіраўнік нацысцкай партыі — А.В.) усходняй маркі (акругі) — Остмарк (Ostmark). Тут Кубэ разгарнуў актыўную палітычную дзейнасць, у выніку якой колькасць сяброў НСРПГ у гэтым рэгіёне павялічылася з 66 чалавек у 1928 годзе да 10 тысяч у 1931-м і дасягнула 80 тысяч у 1933 годзе. У гэты час ён становіцца рэдактарам газеты і робіць яе рупарам НСРПГ. У маі 1928 года Кубэ абраны дэпутатам прускага ландтагу, і тут ён па даручэнню Гітлера прыступіў да кіраўніцтва фракцыяй нацыянал-сацыялістаў. Дзейнасць Кубэ ў ландтагу адыграла важную ролю ў перамозе гітлераўскай партыі ў Германіі.

Вялікай заслугай Кубэ было скасаванне 27 верасня 1928 года забароны на публічныя выступленні Адольфа Гітлера ў межах Прусіі. Асабістыя якасці Вільгельма Кубэ — яго красамоўнасць і талент пераконваць — мелі пры гэтым вырашальнае значэнне, бо ў той час фракцыю нацыянал-сацыялістаў прадстаўлялі ў ландтагу ўсяго толькі шэсць дэпутатаў. Адольф Гітлер ніколі не забываў паслугі, якія аказаў яму Кубэ, і ў гэтым далей мы ўпэўнімся.

Пасля перамогі НСРПГ на выбарах 25 сакавіка 1933 года Кубэ заняў пасаду обер-прэзідэнта Берліна і Брандэнбурга, 1 чэрвеня 1933 года стаў гаўляйтарам акругі Курмарк, якая была ўтворана пасля аб'яднання ранейшых партыйных акруг Остмарк і Брандэнбург.

У 1933 годзе Кубэ ўжо обер-прэзідэнт Берліна і Брандэнбурга і обер-прэзідэнт правінцыі Грэнцмарк Позен-Вестпрайсен, за што яго жартам называлі двойчы «обер-прэзідэнт». 29 верасня 1933 года яму было прысвоена званне оберфюрэр СС, а 27 студзеня 1934 года ён адразу «вырас» да вайсковага звання генерал-группэнфюрэр СС. Заслугі па партыйнай лініі прыносяць яму залаты нацысцкі значок НСРПГ. У Кубэ было шмат прэстыжных пасад: у 1933–1936 гадах быў дэпутатам Рэйхстагу, прускім дзяржаўным дарадцам, сябрам Акадэміі германскага права, экспертам у галіне германскай гісторыі ранняга перыяду, выконваў іншыя дзяржаўныя абавязкі. І ў дадатак да ўсяго Кубэ плённа займаўся літаратурнай творчасцю і публіцыстыкай. Асабліва папулярнай стала яго драма «Таціла», якая была выдадзена ў 1920 годзе і перавыдадзена ў 1933-м. Кубэ быў аматарам тэатра старажытнага часу. У яго п'есе «Таціла» праслаўляліся «германскі гераічны дух і веліч нямецкіх жанчын» на матэрыяле Вялікага перасялення народаў у IV стагоддзі. Зварот яго да велічы «старых германцаў» быў відавочным значна пазней. Ужо ў Мінску Кубэ загадаў паставіць сваю п'есу. Але і тут водгукі былі вельмі сціплыя і стрыманыя. П'еса «Таціла» пасля гэтага назаўсёды сышла са сцэны.

У 1935 годзе Кубэ развёўся са сваёй жонкай Маргарэт Шмідт, ад якой засталіся двое яго сыноў — 15 і 20 гадоў. Прычынай стала амурная прыгода, якая перарасла ў шматгадовае палкае каханне. Менавіта ў перыяд свайго трыумфальнага ўзыходжання па нацысцкіх іерархічных прыступках 48-гадовы Кубэ закахаўся ў юную актрысу правінцыйнага тэатра Аніту Ліндэнколь, якая іграла галоўную ролю ў яго п'есе «Таціла».

Але паспяховая кар'ера Кубэ раптоўна абарвалася. І віной быў ён сам, бо праігнараваў вядомую народную мудрасць: «Не капай яму другому, сам патрапіш у яе». У красавіку 1936 года Кубэ накіраваў вярхоўнаму суддзі НСРПГ


Вільгельм Кубэ і яго жонка Аніта з невядомымі афіцэрамі каля рэзідэнцыі ў Прылуках

Вальтэру Буху ананімны ліст, дзе выказаў думку: ці можа той, хто так жорстка пераследуе яўрэяў, ажаніцца з семіткай?

Тут Кубэ яўна пралічыўся. Ён не прадбачыў вынікі, бо абвінавачанне партайгеносе В. Буха кідала цень і на яго паплечнікаў, і на партайгеносе Марціна Бормана, зяця Буха. Падобныя сур'ёзныя прамашкі Кубэ будзе рабіць і надалей у сваёй кар'еры. Але атрымалася тое, чаго ананім не чакаў. Прыніжаны, абражаны Бух гэту справу не пусціў на самацёк. Гестапа хутка вылічыла ананіма-жартаўніка. Сам Адольф Гітлер, пачуўшы гэтую гісторыю, вырашыў сурова пакараць Кубэ. Герман Герынг — у той час прускі прэм'ер-міністр — па загаду Гітлера даў яму адстаўку.

Апынуўшыся ў апале, любімчык Гітлера служыў цяпер у сціплым вайсковым званні ротэнфюрэра СС (паводле іншых крыніц — у званні шараговага эсэсаўца) у канцлагеры Дахаў пад камандаваннем свайго будучага ад'ютанта Карла Вільдэнштэйна, які разам з Кубэ служыў у Мінску да самага яго забойства.

У складаны перыяд жыцця Кубэ Гітлер успомніў палымянага прамоўцу, заўзятага антысеміта і працягнуў яму руку дапамогі. 20 красавіка 1941 года Кубэ павіншаваў Гітлера з днём нараджэння. Фюрэр загадаў перавесці Кубэ на больш прыстойную пасаду. Разглядаліся тры варыянты: пасада куратара Вышэйшай тэхнічнай школы, куратара Медыцынскай акадэміі ў горадзе Данцыг і куратара Кёнігсбергскага ўніверсітэта. Але Гітлер на гэтыя пасады не даў згоды і настаяў на тым, каб Кубэ абавязкова быў прызначаны на адказную пасаду на Усходзе.

22 чэрвеня 1941 года пачалася Вялікая Айчынная вайна. Яна і вырашыла кадравае пытанне з Кубэ. Калі войскі Трэцяга рэйху ўжо знаходзіліся пад Смаленскам, у Стаўцы Гітлера 16 ліпеня 1941 года адбылася нарада, у якой удзельнічалі Борман, Герынг, Гімлер, Розенберг. Сярод іншых пытанняў абмяркоўваліся кандыдатуры кіраўнікоў адміністрацыі акупаваных тэрыторый. Паводле сведчання гісторыка А. Даліна, «калі Гітлер запытаў, ці не лепш прызначыць Кубэ на Маскоўскую вобласць, дык сустрэў пярэчанні з боку Герынга і Розенберга, бо на гэтую пасаду яны мелі ўласныя кандыдатуры. Але менавіта Розенберг назваў кандыдатам на пасаду генеральнага камісара Беларусі Вільгельма Кубэ. 17 ліпеня 1941 года сваім загадам Гітлер зацвердзіў генеральным камісарам генеральнай акругі Беларусі ў рэйхскамісарыяце Остланд Вільгельма Кубэ.

У горад Мінск Кубэ прыбыў 1 верасня і неадкладна пачаў прымаць справы ў начальніка ваеннага ведамства. Генеральны камісарыят Беларусі ў той час месціўся ў будынку на плошчы Свабоды, а Кубэ спачатку жыў па вуліцы Герцэна, 17.

Спачатку Генеральны камісарыят Беларусі размяшчаўся ў «Доме Патсдам» — былым Доме адпачынку, у якім знаходзілася палявая камендатура, пасля гэта ўстанова пераехала ў «Высокі дом» (так немцы называлі Дом урада ў Мінску. — А.В.). Колькасць нямецкіх супрацоўнікаў, якія паходзілі з тэрыторыі Трэцяга рэйху, у кастрычніку 1942 года складала 265 чалавек, у пачатку 1944 года павысілася да 324 чалавек. Служылі і мясцовыя карнікі-паліцаі. Дарэчы, я нагадаю чатыры слаі беларусаў, з якіх нямецка-фашысцкія акупанты набіралі беларускіх паліцаяў: ахвяры сталінскіх рэпрэсій і таталітарнага рэжыму, злачынцы і спекулянты, савецкія агенты і ваеннапалонныя. Да Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску (які займаў тэрыторыю прыкладна 375 тысяч квадратных метраў) жыло 238 тысяч 772 чалавекі, у сярэдзіне 1942 года іх было каля 105 тысяч.

Прызначэнне Кубэ на пасаду генеральнага камісара Беларусі ў найвышэйшых колах палітыкаў Трэцяга рэйху выклікала сапраўдную сенсацыю. Блізкі супрацоўнік Гебельса Вільфрэд фон Овен у 1974 годзе пісаў, што гэта прызначэнне «адлюстроўвала ўсю неразважлівасць і легкадумнасць нашай, так званай, усходняй палітыкі». Такое выказванне адлюстроўвала непрыязныя адносіны паміж Гебельсам і Кубэ.

Справа ў тым, што Кубэ дазволіў сабе публічна раскрытыкаваць кнігу Гебельса, акрэсліўшы яе: «Я — пра Сябе». Гебельс і іншыя члены гітлераўскай камарыллі затаілі злосць на Кубэ.

Супраць рашэння Гітлера выступаў і Розенберг, але Лямерс нагадаў яму, што Гітлер настойвае на прызначэнні Кубэ. Лёзе, даўні сябра Кубэ, таксама быў супраць рашэння фюрэра, але з іншых прычын: ён вельмі добра ведаў «рэзкі, імпульсіўны і поўны супярэчнасцяў характар» Кубэ і таму баяўся, што яго дзейнасць на пасадзе генеральнага камісара Беларусі можа стаць прычынай сур'ёзных непаразуменняў і канфліктаў у ўсімі ўладнымі структурамі нямецкай акупацыйнай адміністрацыі ў Беларусі, што ўрэшце і атрымалася.

Для высвятлення сапраўдных матываў гэтага рашэння Гітлера не хапае дакументальных крыніц. Паводле некаторых згадак, прызначэнне Кубэ на другасную пасаду ў Мінску азначала, што яму далі магчымасць для рэабілітацыі пасля пяці гадоў «пакарання» пад наглядам Гітлера.

Але гэты, як кажуць, мяккі аргумент проста блякне перад сенсацыйным фактам: Гітлер у далейшым планаваў прызначыць Вільгельма Кубэ рэйхскамісарам у Маскве — даверыць яму самую высокую пасаду на Усходзе, усю тэрыторыю Савецкага Саюза.

Важна было ўлічваць, што Кубэ атрымаў сваё прызначэнне дзякуючы падтрымцы самога Гітлера, насуперак жаданням найвышэйшых чыноўнікаў Трэцяга рэйху. Гэта была моцная падтрымка.

Вось так трапіў Кубэ на пасаду генеральнага камісара Беларусі. І ён пачаў аддана служыць Гітлеру. Апякунства фюрэра адыграла важную ролю ў службовым становішчы Кубэ. Перад ім паўсталі ў Беларусі складаныя адміністрацыйныя і палітычныя праблемы, але ён атрымаў больш шырокія паўнамоцтвы, чым генеральныя камісары ў Прыбалтыйскіх краінах — Літве, Латвіі і Эстоніі.

5 лістапада 1941 года Розенберг запэўніваў Лямерса, што пазіцыя генеральнага камісара Беларусі Кубэ — кіраўніка Беларусі — амаль з 11-мільённым насельніцтвам, будзе раўназначная пасадзе рэйхскамісара. Магчыма, Розенберг пры гэтым улічваў, што Беларусь толькі да часу будзе звязана з Прыбалтыкай.


Плошча Свабоды ў Мінску і разбураны атэль «Еўропа»

ВЫСТАВА

# ЭПОХА ЗРУЙНАВАНАЙ ІМПЕРЫІ

Таццяна УЛАСЕНКА

**У Мінску адкрылася выстава графікі незвычайнага чалавека — беларуса Васі Шугалея, якога даўно няма разам з намі, але яго творчасць да гэтага часу натхняе людзей на добрыя і светлыя ўчынкі.**

Адкрыў вечар памяці паэт-вальнадумец Адам Глобус, які ведаў творцу асабіста. Ён з задавальненнем цытаваў Васевы сэксуальныя вершы: «Я ха-чу бу-бу ў бу-бу! Я бу-бу цябе ў бу-бу!» і распавядаў пра сумесныя з ім прыгоды, якія здараліся падчас блуканняў па руінах разваленай імперыі.

Вася (менавіта так і толькі так пяшчотна называюць яго сябры і прыхільнікі творчасці) нарадзіўся ў Мінску ў 1970 годзе. У 1990-я яму ўдавалася быць у шматлікіх іпастасях: паэтам, музыкай, зоркай экрану, рок-артыстам, перакладчыкам паэзіі Джыма Морысана, прадзюсерам. Ён быў завадатарам і натхняльнікам шматлікіх арт-хаўсных тусовак і вясёлым героем музычных перадач на тэлебачанні. Шматрукі ШыВася ўвасабляў у жыццё безліч праектаў, яднаючы вакол сябе мінскую, піцерскую і маскоўскую публіку. Адзін з ганаровых гасцей выставы, культуролаг Максім Жбанкоў так сказаў пра творцу: «Ён меў класічную адукацыю і пісаў нестандартныя тэксты. Гэта шматгранны чалавек той эпохі, якая нараджала хуткія лёсы. Шалёны, адвязны, шызануты і неверагодна прыгожы… Вялікая асоба, вялікі майстар, шматлікія чарнавікі якога ніколі не ператтвараліся ў тэксты. Ён хутка згарэў падчас той эпохі, якая забівала сваіх дзяцей».

Васю Шугалея забілі ў прыватнай кватэры ў Маскве ў пачатку 2000-х. Інфармацыйныя крыніцы паведамлялі, што, па версіі следства, гэта былі кватэрныя злодзеі. На фоне яго дабрыні і адкрытасці, веры ў людзей, як характарызуюць Васю сябры, версія і сапраўды выглядала праўдападобнай. Але загадак засталося шмат.



Фота аўтара

Адам Глобус цытуе вершы свайго сябра Васі Шугалея

На той момант Вася быў вядомым прадстаўніком нефарматнай музыкі. Ён упершыню засвяціў свой гурт «Ы.Ы.Ы» яшчэ напачатку 1990-х у культавай перадачы «Праграма А». Тады гэта быў першы беларускі рок-гурт, які патрапіў на тэлеэкраны.

Прадзюсаваў у Маскве гурты «Ляпіс Трубяцкой», «Бі–2», «Жукі», «Забароненыя барабаншчыкі»… Разам з Філіпам Кіркоравым з'яўляўся аўтарам праекту «Сюрпрыз для Алы». Пад яго вядомую песню «Усё нармальна, мама!» прачыналася па суботах незалежная беларуская краіна. А вядомейшы яго «біт» «Ветер знает» у выкананні гурта «Брава» гучаў з кожнага моднага тады «Мерседэса».

Вася актыўна супрацоўнічаў з вядучым «Муз-ТВ» Міхаілам Рольнікам, прымаў удзел у яго праграме «Shit-парад», а таксама ў тэлепраекце Васіля Стрэльнікава «Вася ін да Хаус».

Адным з самых вядомых і доўгажывучых яго праектаў стаў гурт «Ы.Ы.Ы», які ганарова ўзяў на сябе місію сабраца былым складам і прадставіць Васеву творчасць на вечары памяці ў галерэі «Ў». Удзельнікі вясёлага, каламбурнага гурта, якія гралі самі сябе і пра сябе, узнавілі дух той шалёнай, вар'яцкай эпохі, якая адбівалася ў кожным творчым кроку Шугалея. Яны запалілі публіку, выканаўшы старыя завадныя хіты: «Усё нармальна, мама», «Валянціна», «Нора», «Научи меня ругаться матом на узбекском языке», «Хуссейн», «Подруга». У якасці вакалістаў выступілі лідары гуртоў «Петля Пристрастия» і «Кассиопея» Ілля Чарапко-Самахвалаў і Аляксандр Памідораў.

Вядомы ў творчых колах малады мастак, які працуе пад псеўданімам А.Р.Ч., так выказаўся наконт творчасці Васі: «Я не ведаў гэтага чалавека асабіста, бо гэта ўжо зусім іншая эпоха і старэйшае пакаленне, але як мастак магу сказаць, што яго графіка вельмі адметная, яскравая, са сваім асабістым тварам. Карціны, якія мы тут бачым, і яго музычныя хіты, якія выканаў гурт «Ы.Ы.Ы», гэта цікавая і актуальная творчасць. У гурта, які ўз'яднаўся да выставы карцін «20 000 запальнічак» атрымалася нешта глыбіннае, андэграўнднае, сваё».

ПАДЗЕЯ

# ПАД ГУКІ ТАЯМНІЧАЙ ВАМОЛЫ

Анатоль МЯЛЬГУЙ

**На мінулым тыдні адбылася нешараговая падзея, якая для шматлікіх аматараў «жывой» беларускай рок-музыкі стала падставай зноў наведаць абноўлены мінскі клуб «Re: public». Тут прэзентаваўся новы альбом «HMR» папулярнага рок-гурта «IQ48».**

Па музыцы гуртоў кшталту «IQ48», як па маркерах, вызначаецца ўзровень усёй беларускай рок-музыкі. Таму шматлікія слухачы з непадробным інтарэсам з'віліся на прэзентацыю, каб на «свае вушы» пачуць новыя песні і старыя хіты «IQ48».

Арганізатары канцэрта-прэзентацыі вырашылі, што музыка «IQ48» будзе ўспрымацца яшчэ больш рэльефна, калі разам з імі на сцэну клуба спачатку выйдуць сябры-музыканты з гурта «Разбітае сэрца пацана», хоць стылістычна яны выконваюць кантрастную музыку. Але гэта не засмуціла запрошаных музыкантаў, якія выкарысталі прадстаўленую магчымасць нагадаць слухачам свой звышапулярны поп-трэш з элементамі танцавальнага шоў.

Музычны сэт «Разбітае сэрца пацана» распачало кампазіцыяй



Спявае Аляксандр Ракавец



«РСП» и «ЭВМ»

«Смаргонь», а таксама музыканты нагадалі слухачам песні з новага альбома «Не налівай»: «Смартфон», «Хонгільдон», «Ніферціці», «Лук і часнок», а таксама новыя песні і старыя хіты, кшталту, «No comment», «Венесуэла». З асаблівым энтузіязмам слухачы ўспрынялі любімую кампазіцыю, па сваёй сутнасці гратэскна-гумарыстычную замалёўку, «Палюбіла гапара», якую суправаджалі дзяўчаты з танцавальнага шоў «ЭВМ».

Але як толькі «айк'юшнікі» выйшлі на сцэну з першай кампазіцыяй, то стала зразумела, чаму свой новы альбом мінскія музыканты назвалі «HMR» (heavy-metal-rock) — замест саксафона, на якім саліраваў у свой час Д. Дзеравянка, цяпер грае новы гітарыст Павел Яноўскі. Таму гук гурта «IQ48» стаў больш шчыльным, пранізваючым залу клуба «металічнымі» рыфамі і сола. Да таго ж, у калектыўным гучанні гурта значна павялічылася нагрузка і на асноўнага гітарыста «IQ48» Яўгена Бузоўскага, які падчас канцэрта прадэманстраваў значны выканаўчы і стылістычны прагрэс.

Што тычыцца інструментальных навінак гурта, то нельга не адзначыць выкарыстанне музыкантамі такога экзатычнага інструмента, як вамола — доўгай металічнай рэйкі з гуказдымальнікам, на якой нацягнута басовая струна, сіла нацяжэння якой змяняецца з дапамогай спецыяльнай ручкі наверсе інструмента. А грацьц трэба на вамоле з дапамогай барабаннай палачкі. Гэтую экзотыку, якая па гучанні нагадвае касмічны басавы інструмент, прадставіў слухачам бас-гітарыст гурта Улад Плюшчаў. Дарэчы, вамолу ён вырабіў сам ды апгрэйдзіў яе зялёнымі лямпачкамі.

Асноўным жа звяном, якое злучала стылістыку і акустычную атмасферу альбома «HMR» і папярэдніх дыскаў «IQ48», можна лічыць манеру выканання саліста гурта Аляксандра Ракаўца, які спалучае металічны гроул і рэпчытку тэкстаў. Гэта можна было зразумець з першых жа кампазіцый, якія былі прадстаўлены на прэзентацыі: «Сабой заставацца», «Просты хлопец», «Хвост пісталетам», «Парыж», у якой музыканты выкарысталі мелодыю з рэпертуару Эдзіт Піаф. Падчас выканання песні «Эмігрант» адбываліся здымкі відэакліпа.

Другую частку праграмы прэзентацыі можна было б назваць настальгічнай, бо яна ўключала «жывое» выкананне знакамітых хітоў мінулых гадоў. Напрыклад, «Карыду», «Гэй, наперад» (на верш Я. Купалы), якія загучалі па-новаму, больш яскрава і па-сучаснаму. А калі на сцэну выйшаў госць з Масквы, былы ўдзельнік і адзін з заснавальнікаў «IQ48» Павел «Фрэйд» Зыгмантовіч, то слухачы ў прадчуванні новых уражанняў пачалі скандзіраваць назву чаканай кампазіцыі: «Тапол!». Так яно і здарылася, пад «Тапол!» зала клуба выбухнула станоўчымі эмоцыямі, а многія слухачы пусціліся ў энергічныя скокі!

Дарэчы, на новым альбоме гурта «IQ48» «HMR» Павел стаў аўтарам тэкстаў песень «Эмігрант» ды «Парыж», у якіх ён выказаў, акрамя іншага, сваю тугу па Радзіме, надзею на хуткае вяртанне ў Беларусь і супрацу са сваімі сябрамі.

Але гэта быў не адзіны сюрпрыз. Ганаровым госцем прэзентацыі стаў знакаміты беларускі рэпер Vinsent, які ніколі не адмаўляецца ад магчымасці выступіць з айчыннымі рок-музыкантамі. Вось і ў гэты дзень рэпер у выразнай рок-манеры разам з «IQ48» выканаў энергічную кампазіцыю «Дай сілы», якая выклікала дадатковую цікаўнасць да дыска ў асяродку аматараў рэп-чытанак.

Музыканты «IQ48» запрасілі на сваю прэзентацыю і іншага ветэрана беларускага рэп-руху — Аляксандра Памідорава. Аляксандр нагадаў слухачам, як гучыць іх сумесны трэк «Выйсце», а таксама хіт «Святло і цемра». На жаль, песню Аляксандру завяршыць не ўдалося: на сцэну ўварваўся не зусім цвярозы хуліган, якога музыканту давялося ўрэзоньваць ды здаваць ахове клуба. Непрыемны момант ідэальнай прэзентацыі, але затое ўсе прысутныя ўпэўніліся ў сапраўдных мужчынскіх якасцях «вялікага ва ўсіх сэнсах» чалавека і музыканта Аляксандра Памідорава!

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае ўнітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 1148

Падпісана да друку 11.11.2011. 8.00.

Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.